ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Цэнтральная раённая бібліятэка

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# «ШАНУЕМ ДЗІВА НА ПЛАНЕЦЕ – СВЯТУЮ НАШУ БЕЛАРУСЬ»

Зборнік сцэнарных матэрыялаў

да Дня незалежнасці РБ

Кобрын, 2018

ББК 78.374.3

Шан 20

Шануем дзіва на планеце – святую нашу Беларусь : зборнік сцэнарных матэрыялаў да Дня незалежнасці РБ / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; склад. А. М. Міхейкіна-Белякова. – Кобрын, 2018. – 80 с.

У зборнік увайшлі сцэнарыі да Дня незалежнасці РБ. Пры складанні зборніка выкарыстаны сцэнарныя матэрыялы з часопісаў «Бібліятэка прапануе», «Роднае слова» і матэрыялы аддзела бібліятэчнага маркетынгу.

Дадзенае выданне прызначана ў дапамогу супрацоўнікам публічных бібліятэк і ўсім тым, хто зацікаўлены ў правядзенні мерапрыемстваў патрыятычнай тэматыкі.

Склад.: А. М. Міхейкіна-Белякова

© ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

**ЗМЕСТ**


- “ХТО МЫ? МЫ — БЕЛАРУСЫ…”
  літаратурна музычная кампазіцыя ________________________С. 4 – 11
- ТЫ ЖЫВЕШ У БЕЛАРУСІ
  вусны часопіс ___________________________________________С. 12 – 16
- МЫ, НАРОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
  сцэнарый выступлення ЛПГ ____________________________С. 17 – 24
- ГАНАРУСЯ ТАБОЙ, БЕЛАРУСЬ!
  сцэнарый свята для першакласнікаў ______________________С. 25 – 30
- ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎ – ЗЯМЛЯ СВЯТАЯ
  літаратурнае свята ____________________________________ С. 31 – 37
- "Я - БЕЛАРУС! Я ГАНАРУСЯ, ШТО МАЮ ГЭТАЕ ІМЯ...”
  урок-вечарына __________________________________________ С. 38 – 52
- ДЗЕЦІ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ
  метадычныя парады па арганізацыі і правядзенню гістарычнай віктарыны___________________________________________ С. 53 – 66
- “БЕЛАРУСЬ МАЯ, РОДНЫ КРАЙ...”
  тэматычны вечар___________________________________ С. 67 – 75
- “ЖЫВУ У БЕЛАРУСІ – І ТЫМ ГАНАРУСЯ”
  патрыятычна-выхаваўчая гульня__________________________С. 76 – 79

# “ХТО МЫ? МЫ — БЕЛАРУСЫ...”

*Літаратурна-музычная кампазіцыя*

*“Хто мы? Мы — беларусы...” : літаратурна-музычная кампазіцыя // Яфімава М. Б. Зямля бацкоў, зямля святая : матэрыял для правядзення літ. вечарын / М. Б. Яфімава. – Мінск : ВДП “Нар. асвета”, 1997. – С. 16-25.*

Прапануецца тэкст і адзін з магчымых варыянтаў выканання літаратурнай кампазіцыі “***Хто мы? Мы — беларусы...”.*** Можа быць зменена колькасць выканаўцаў, іх размяшчэнне на сцэне, заменены ці скарочаны тэксты некаторых твораў, выкарыстана іншае музычнае афармленне і г. д. Галоўнае, каб прагучала кампазіцыя цэласна, у належным тэмпе, з добра наладжанай узаемасувяззю чытальнікаў. На літаратурных вечарынах можа быць выканана ўся кампазіцыя, яе асобныя часткі ці нават асобныя творы што ўключаны ў яе.

*Гучыць песня “Беларусь — мая песня” (сл. М. Браўна, пераклад А. Бялевіча, муз. Ю. Семянякі). Пасля 1-га куплета музыка гучыць цішэй, на сцэну (перад заслонай) выходзяць 3-і і 4-ы чытальнікі.*

**3-і чытальнік**. Літаратурна-музычная кампазіцыя.

**4-ы чытальнік**. Хто мы?

**3-і і 4-ы чытальнікі**. Мы — беларусы.

**3-і чытальнік**. У кампазіцыі выкарыстаны творы беларускіх паэтаў...

**4-ы чытальнік**. ... брашура Вацлава Ластоўскага “Што трэба ведаць кожнаму беларусу”.

*Музыка на нейкі момант гучыць грамчэй, заслона адкрываецца. Выходзяць чытальнікі, па баках сцэны — 1-ы і 2-і чытальнікі, у цэнтры — 5, 6, 7-ы чытальнікі. Песню “Беларусь — мая песня” змяняе мелодыя “Радзіма мая дарагая" (сл. А. Бачылы, муз. У. Алоўнікава).*

**1-ы чытальнік.**

Белая Русь мая —
Белая кніга!
Між берагоў,
Ахрышчоных Нямігай,
Літар крывавяцца
Берагі,—Край
шматпакутны,
Край дарагі!
... Ты — мая памяць,
Сляза і фатыга,
Млечны мой Шлях
У бясконцасць, Няміга,
Неадбарвовіцца
Весняя крыга,
Бы не з крыніц,
З ран сцякае Няміга
Цераз завалы
Гора, тугі, —
Край шматпакутны,
Край дарагі!
Лёс мой,
І мне не патрэбны другі,
О, край шматпакутны,
Край дарагі!

*А. Лойка. Белая Русь мая*

*Апошнія радкі, як рэха, не вельмі гучна паўтараюць, змяніўшы займенік "мне" на "нам", чытальнікі, што стаяць на сцэне: "Нам непатрэбны другі..." (словы "О, край шматпакутны, край дарагі!" можа сказаць толькі адзін з чытальнікаў).*

**2-і чытальнік.** Мы ўзышлі не з насення, што ветрам занесена,
Мы не дзікай травы самарослыя парасткі —
У глыбінях зямлі, гераічнай і песеннай,
Нашых душ карані — з вузлякамі упартасці.

**5-ы чытальнік.** Сокам вотчынных гоняў ад роду мы ўспоены,
Сонцам родных нябёс мы з маленства аблашчаны,
Як асілкі дубы над дняпроўскімі поймамі —
Паяднаныя часам нашчадкі і прашчуры.

**6-ы чытальнік.** Мы на золку далёкім ардзе не скарыліся,
Славай Грунвальда выйшлі ў вялікія ратнікі.
Нас будзіў да святла стук друкарань скарынінскіх,
Да братоў мы гарнуліся сэрцамі братнімі.

**7-ы чытальнік.** Каліноўскі дарэшты пазбавіў нас кволасці —
Веру — мужнасць сваю завяшчаў нам з-пад віселыні.
З гнеўнай лірай Купалы і эпасам Коласа
Мы спазналі сябе і свой голас узвысілі.

**2-і чытальнік.** Гэтай повязі кроўнай, якой мы прывязаны
Да бацькоўскай зямлі, —не парвуць, не растурзаюць
Аніякія буры-вятры непрыязныя, —
Нашы сэрцы ад іх толькі больш загартуюцца.

*Ніл Гілевіч. Лірычны каментар да нашага радаслоўя*

**1-ы чытальнік**. Хто мы?

**Усе чытальнікі**. Мы — беларусы.

**2-і чытальнік**. Чаму мы называемся беларусамі?

**5-ы чытальнік**. Бо мы нарадзіліся беларусамі, ускарміліся з беларускай зямлі, ўзгадаваліся і жывём на Беларусі.

*Пачынае гучаць мелодыя песні "Жураўлі на Палессе ляцяць" (сл. А. Ставера, муз. І. Лучанка). Выходзіць 8-ы чытальнік (дзяўчына).*

**8-ы чытальнік.** Радзілася я ў Беларусі,
Дзе ціхі,
Задумлівы бор.
Ляцяць сюды
З выраю гусі
Да сініх,
Цудоўных азёр.
Стаяць векавыя дубровы,
Даносіцца ласкавы шум.
І сонца , і ветрык вясновы
Цяплом саграваюць душу...
Радзілася я ў Беларусі,

Дзе срэбрам крыніцы звіняць,
Сюды з крыкам радасным гусі
З далёкага поўдня ляцяць.

*Авяр'ян Дзеружынскі.Радзілася я ў Беларусі*

*Выконваецца песня "Жураўлі на Палессе ляцяць" Чытальнікі становяцца паўкругам.*

**7-ы чытальнік**. Я — беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі,
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі.
Я — беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя:
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма.
Я — беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую, і здаля...

*Ніл Гілевіч. Я — беларус*

*Музыка гучыць грамчэй, потым ізноў гучыць ціхшэй.*

**1-ы чытальнік**. Як называецца той, хто выракаецца свайго народа?

**2-і чытальнік**. Той, хто выракаецца свайго народа, — здраднік, душапрадаўца. Здрада — гэта найцяжэйшае ліхадзейства, якое толькі ведаюць людзі.

**8-ы чытальнік**. Няма на свеце горшае брыды,
Як здраднік-вырадак і адшчапенец,
Што даражэй свой хлеб сабачыцэніць
За родны край, дзе спяць яго дзяды;
Што нават выракся імя свайго
І на Радзіму брэша ў злобе дзікай,
Таго не знаючы, што ёй, вялікай,
Агідна нават плюнуць на яго!

*Ніл Гілевіч. Няма на свеце горшае брыды*

**1-ы чытальнік**. Па чым лягчэй спазнаць, што мы беларусы?

**2-і чытальнік**. Найлягчэй гэта спазнаць па нашай мове. Мова злучае людзей у адзін народ.

**5-ы чытальнік**. Наша мова — адна з найчысцейшых у славянскай сям'і моваў. Яна пекная, мілагучная, вельмі спеўная, праз што надаецца вельмі да паэзіі і спеваў.

*Гучыць мелодыя беларускай народнай песні "Рэчанька".*

**6-ы чытальнік**. Ты адкуль бруішся, мова?
З сініх нёманскіх крыніц?
Па зямлі збіраю словы,
Нібы россыпы суніц.

Мілая, адзіная,
Нам, нашчадкам,
Дадзена
Любаю радзімаю
Ад дзядоў і прадзедаў.

*Уладзімір Мазго. Родная мова*

**8-ы чытальнік**. Мова мая!
Што я без цябе?
Глухая. Глухая.
Моўча вужом віецца.
Не чую,
Як птушкі шчабечуць,
Як лашчыць бераг вада,
Як сонечны бераг смяецца.

**5-ы чытальнік**. Што я без цябе,
Мова мая?
Нямая. Нямая.
Нібы гаварыць не наўчылі.
Не вырвуцца словы:
Матуля,
Каханы,
Айчына.
Што я без цябе,
Мова мая?..

*Таіса Мельчанка. Роўнйя сярод роўных*

**2-і чытальнік**. Адбяры ў мяне мову,
І я задыхнуся.
Не хачу быць тубыльцам
У Беларусі.Адбяры ў мяне мову,
Я духоўна загіну.
Як бы мог размаўляць з Каліноўскім, Скарынай...
Адбяры ў мяне мову,
Будзе крыўдна, балюча.
Не пачую тады
Роднай матчынай песні.
Адбяры ў мяне мову,
І я страчу свой голас.
І не прыйдуць мне ў сэрца
І Купала, і Колас!

*Паўлюк Пранузa. Адбяры ў мяне мову...*

**1-ы чытальнік.** Мова мая!
Што ты ёсць на свеце?

**7-ы чытальнік.** (дзяўчына). Я — роўная
Сярод роўных,

Бо выжыла
Нядобразычліўцам на злосць.
Я ёсць —
Беларуска кроўная.
Ніштo не суцішыць
Маю хаду....
Я ў вечным
Сваім абнаўленні
Знадзеяй
У заўтра іду!

*Таіса Мельчанка. Роўная сярод роўных*

**1-ы чытальнік**. Што б сталася, каб мы забыліся свае роднае мовы?

**2-і чытальнік**. Калі б мы нашу родную, Богам нам дадзеную і асвячоную беларускую мову закінулі, забыліся, а прынялі чужую,— тады па ўсіх нас і след загінуў бы на зямлі.

**4-ы чытальнік.**

Страціў слова, страціў спадчыннае слова —
Штосьці страціў у душы абавязкова!
Можа — годнасці хоць кропельку малую?
Можа — мудрасці хоць дробачку якую?
Можа — памяці хоць зернетка-іскрынку?
Можа — праўды хоць пылінку-парушынку?
Я не ведаю дакладна, што ты страціў,
Запытайся — ці не скажа табе маці...

*Ніл Гілевіч. Страціў слова...*

**1-ы чытальнік**. Хто не шануе родную мову, той не шануе сябе самога — ні свой род, ні сваіх дзядоў, бацькоў, якія той жа мовай гаварылі.

*Выходзіць 3-і чытальнік.*

**3-і чытальнік**. Гавары роднай
Мовай сваёй,
Прыгажэй
За пялёсткаў вішнёвых,
Што крыштальнай
Сваёй чысцінёй
Выпраменьвае
З ласкаю словы.
Гавары роднай
Мовай сваёй,
Што гадамі
Ніштo не скрышыла.
Таму наканавана ёй
На вякі —
Неўміручасць і сіла.

*Авяр'ян Дзеружынскі. Гавары роднай мовай.*

*Выходзіць 4-ы чытальнік.*

**4-ы чытальнік**. Адкрываю, як свет, нанова беларускае роднае слова, пераліўістае — як праменчык, вясёлкавае — як ручэй, цёплае — як агеньчык добрых тваіх вачэй, светлае — як маланка, гнеўнае — як пярун, ціхае — як калыханка, вечнае — як Беларусь!

*Анатоль Канапелька. Роднае слова*

**6-ы чытальнік**. Мова мая!
Ты — як хлеб святы.
Святою
І будзеш заўсёды.

*Таіса Мельчанка. Роўная сярод роўных*

**1-ы чытальнік**. Бацькаўшчына?

**2-і чытальнік.** Бацькаўшчына – гэта той край, дзе мы нарадзіліся івыраслі, дзе жывуць нашы бацькі і дзяды жылі.

**7-ы чытальнік**. Я шчаслівы, што ў суджаны час
Нарадзіўся на гэтай зямлі,
Дзе такія густыя лясы
І такія спакойныя рэкі.
Дзе вясной — непаўторна штораз
Зелянеюць разлогі-палі,
Дзе ўладар гэтай дзіўнай красы —
Ты, народ мой, на вечныя векі.

*Гучыць мелодыя песні "Спадчына" (сл. Я. Купалы, муз. І. Лучанка).*

**5-ы чытальнік**. Я параўнаю з дзівасілам зямлю,
што дадзена мне ў спадчыну,
дзе па вяснедужэюць крылы,
вяртае выраймова матчына.Магчыма,тым і ганаруся,што з нашай глебы прарасло і сонца вечнай Беларусі, і мовы вечнае святло!

*Анатоль Канапелька. Параўнаю з дзівасілам*

**1-ы чытальнік**. Якія найбольш характэрныя рысы нацыянальнага характару беларусаў?

**2-і чытальнік**. Вынослівасць, цягавітасць. Там, дзе другі апусціць рукі, беларус будзе цягнуць.

**4-ы чытальнік**. Беларус адрозніваецца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе. *(Ул. Караткевіч.)*

**7-ы чытальнік**. Усе, хто прыязджае да нас, адзначаюць як адну з галоўных рыс беларусаў — гасціннасць. *(Ул. Караткевіч.)*

*Гучыць імклівая бадзёрая мелодыя беларускай полькі. Чытальнікі ідуць са сцэны. Выходзіць 9-ы чытальнік.*

**9-ы чытальнік**. Госці ў хату — беларусы
Рассцілаюць на сталах
Саматканыя абрусы,
Вараць бульбу ў саганах.
Вабяць сыр і паляндвіца,

Некалі маркоціцца.
Гаспадыня-чараўніца
Да загнета коціцца.
Гаманлівая бяседа
Хоць каму падніме дух.
Баба ў бок штурхнула дзеда:
—Не глядзі на маладух!
На старэнькую камоду
Хустачку павесіла.
—Ой, ляцелі гусі з броду, —
Заспявала весела.
Тупне свацця-весялуха:
—Эй, музыка, сып часцей! —
І на полечку-трасухуПазаве баян хутчэй...

*Уладзімір Скарынкін. Госці*

*Полька гучыць грамчэй, у такт музыкі парамі выходзяць чытальнікі удзельнікі вечара, усе скачуць польку. Можна ўключыць выкананне беларускіх прыпевак.*

*Ізноў гучыць мелодыя песні “Беларусь - мая песня”. Усе, хто скакаў польку, становяцца ў цэнтры сцэны.*

**1-ы чытальнік**. Чым мы можам ганарыцца?
**2-і чытальнік**. Мы ганарымся сваей песняй!
**3-і чытальнік**. Мы ганарымся сваей мовай!
**4-ы чытальнік**. Мы ганарымся сваей гісторыяй!
**5-ы чытальнік**. Мы ганарымся сваей роднай зямлёй!
**6-ы чытальнік**. Мы ганарымся,
**7-ы чытальнік**. Што мы — беларусы!
**8-ы чытальнік**. Сваей Айчыны яснае імя,
Нібы ўласнае —
Не дай запляміць...
І светлы цень буслінага крыла
Над рэчкамі, дарогамі, палямі.

*Любоў Тарасюк. Імя Айчыны*

*Гучыць мелодыя песні “Радзіма мая дарагая” (сл. А. Бачылы, муз. Ул. Алоўнікава)*

*Выходзяць наперад два чытальнікі (напрыклад, 5-ы і 6-ы).*

**5-ы чытальнік**. Любаваўся паэт з дзяўчынаю
На зялёны ліст, на чырвоны цвет,
І цябе, Беларусь, Шыпшынаю
Ён назваў, закаханы паэт...
**6-ы чытальнік**. Расцвіла ты, Шыпшына мілая,
А я болю ў душы не таю:
Радыяцыя апаліла,
Апыліла крону тваю.

**5-ы чытальнік**. Не парадуе шчодрая завязь,
І трывога за карані —
Тых дзяцей, што народзяцца заўтра,
А пакрыўджаны ў нашы дні.
**4-ы чытальнік**. Беражыце Шыпшыну, нашчадкі,
Беражыце на шчасце,як след!
Беражыце Шыпшыну, нашчадкі
Гэта — прадзедаў запавет!

*Мікола Маляўка. БеражыцеШыпшыну.*

*Усе ўдзельнікі кампазіцыі выходзяць на сцэну.*

**1-ы чытальнік**. Дбайма ж пра родны край, пільнуймася ж сваіх павіннасцяў перад ім.

***2-і чытальнік***. Стараймася ж, каб імя беларуса заўсёды, ува ўсіх народаў сустракалася з пашанай.

*Мелодыя песні “Радзіма мая дарагая” гучыць на поўную сілу.*

*Заслона закрываецца.*

# ТЫ ЖЫВЕШ У БЕЛАРУСІ

*Вусны часопіс*

*Ты жывеш у Беларусі : вусны часопіс // Да юбілейных вечарын / рэд.-укл. Л. І. Жук. - Мн. : Красіка-Прынт, 2003. - С. 95-103. - (Беларусь святочная).*

*Мерапрыемства пачынаецца словамі (вядучага) настаўніка.*

*Гучыць беларуская народная музыка.*

**1 Вядучы (вучань):** — Прывітанне усім. Зараз перад Вамі адна за адной адкрыпоцца старонкі вуснага часопіса.

**2 Вядучы (вучань):** — Пачакай, пачакай! А можа хто і не ведае, што такое вусны часопіс? Я зараз растлумачу. Наш часопіс — такі ж як і «Маладосць», «Першацвет», толькі Вы яго не чытаеце, а слухаеце.

**1 Вядучы:** — Старонкі нашага часопіса як быццам ажылі.

**2 Вядучы:** — А цяпер глядзіце і слухайце вусны часопіс «Ты жывеш у Беларусі».

**1 Вядучы:** — Яго першая старонка «Беларусь у свеце».

*Гучыць фагнаграма (песні Данчыка), паказваюцца гістарычныю слайды.*

**Дзеці: 1** — Наш родны край — гэта Беларусь, самая прыгожая, самая любая краіна.

**2** — Тут жывеш ты, тут жывуць твае мама і тата, бабуля і дзядуля.

**3** — Усяго нас, жыхароў Беларусі, болып за 10 мільёнаў чалавек. Калі б усе мы, старыя і малыя, сталі побач, узяліся за рукі, дык наш жывы ланцужок працягнуўся б аж да далекай-далёкай Афрыкі і апошні ў ланцужку мог бы павітацца са сланом, толькі, не дай Бог, з кракадзілам.

**4** — Болынасць насельніцтва Беларусі ўладкавалася жыць у гарадах.

**5** — У самым вялікім горадзе Беларусі — Мінску жыве амаль два мільёны чалавек.

**1** — Ёсць у нас невялікія гарады, а ёсць і зусім малыя вёскі, дзе ўсе жыхары добра адзін аднаго ведаюць.

**2** — Беларусь не такая вялікая краіна, як Расія, альбо Амерыка, але ж і не маленькая. Пешшу ад Оршы да Бярэсця чалавек ішоў бы два тыдні і стаптаў бы дзве пары чаравік.

**3** — Надвор’е ў Беларусі — на любы густ. Зімовым вечарам мароз бывае так прыцісне, што можна нос і вушы абмарозіць. А летам, калі не дажджы, а спякота, толькі марожанае выратоўвае.

**Дзеці: 4** — На поўначы І ўсходзе Беларусі зіма даўжэйшая чым на захадзе і поўдні. На Віцебшчыне яблыні зацвітаюць на 10—12 дзён пазней, чым пад Бярэсцем. Вясна прыходзіць у Беларусь з захаду, бо там цёплы акіян | сагравае зямлю, а зіму прыносяць халодныя вятры з : Ледавітага акіяна. Так

што самы цёплы край у нас — гэта Брэстчына, а самы халодны — Віцебшчына.

**5** — Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. Наша і дзяржава невялікая, сухапутная, бо не мае выхаду да мора. Бліжэйшым да Беларусі з’яўляецца Балтыйскае мора.

**1** — 3 Беларуссю мяжуюць нашы суседзі — Расія, Украіна, Полыпча, Літва і Латвія.

**2** — Асноўную болыпасць насельніцтва складаюць беларусы, побач з імі жывуць і працуюць рускія, палякі, украінцы, яўрэі, татары.

**1** — А што гэта за народ — беларусы?

**5** — Жывы, разумны, працавіты і вольналюбівы беларускі народ! Беларусы адрознівавцца шчырасцю, шчодрасцю, гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе. Гэта гасцінны і памяркоўны народ.

*Гучыць музыка («Рапсодыя» для цымбал з аркестрам В. Кузняцова), на яе фоне чытаецца верш Ю. Чыгрына «Ёсць зямля на зямлі».*

**Хлопчык 1:**

Ёсць зямля на зямлі,
Ёсць на свеце зямля,
Куды ўсе караблі Зблізку ідуць і здалля.

**Дзяўчынкі малодшага ўзросту:**

**1** — Мы радзіліся тут,
**2** — Мы хрысціліся тут.
**3** — Тут бацькоўскі наш кут.
**4** — Тут царуе наш люд.

**Дзяўчынка 1:**

Толькі тут нарадзіць
Можна ўласных дзяцей.
Спору ў працы здабыць
Толькі тут найлацвей.

**Дзяўчынка 2:**

Толькі тут мы з табой
Пасядзім у цішы.
Толькі тут супакой
Будзе нашай душы.

**Хлопчык 2:**

Дзе б не быў твой спачын
Даль праз даль відна.
Дом на ўсіх нас адзін
І Радзіма адна.

*Музычная застаўка, выходзіць вядучы.*

**Вядучы 1:** — Адкрываем другую старонку «Беларусь — старажытная краіна».

*Гучыць фанаграма (найгрышы для аркестра «Жалейка» В. Кузняцова), на яе фоне чытаецца тэкст.*

**Дзеці: 1** — Беларусь — старажытная краіна. Яна мае сваю багатую гісторыю.

**2** — Людзі прыйшлі сюды яшчэ сорак тысяч гадоў на-зад. Спачатку кармілісятым, што збіраліў лесе, палявалі на звера, лавілі рыбу.

**3** — Пазней навучыліся гадаваць кароў, свіней, курэй, вырошчваць жыта, гарох, рэпу.

**4** — Апраналіся мужчыны і жанчыны ў белую льняную вопратку. У халодную пару насілі ваўняныя сярмягі (тагачасныя курткі), а зімой — кажухі з авечых скур. Абутак рабілі з ліпавай кары, плялі лапці. А дзеці і зімой, і летам бегалі ў адной льняной кашулі, басанож.

**2** — Нашы продкі размаўлялі на сваёй беларускай мове. Перасяленцы з іншых краін прынеслі з сабой сваю мову — рускую, польскую, яўрэйскую. Але дзяржаўнай мовай застаецца ў нас беларуская.

**1** — Самае старажытнае княства, аб якім мы ведаем з летапісу, — Полацкае. Першыявядомыянампрозвішчы князёў — Рагвалод і яго дачка Рагнеда.

**4** — А потым было на нашай зямлі шмат розных падзей. Ствараліся і развальваліся вялікія дзяржавы, прыходзілі са зброяй нядобрыя чужынцы і з ганьбой адыходзілі.

**3** — А людзі ў часы зацішша адбудоўвалі спаленыя гарады і вёскі, расцілі жыта, складвалі песні, танцавалі.

*Выконваецца танец без музычнага суправаджэння на фальклорнай аснове «Лён трапалі».*

*Музычная застаўка, выходзіць вядучы.*

**Вядучы:** Трэцяя старонка нашага часопісу «Славутыя імёны Беларусі».

*Гучыць «Паланэз» К. Агінскага, на яго фоне чытаецца тэкст.*

**Вучань 1:** Наша зямля узгадавала дзеячаў літаратуры, мастацтва, палітыкаў і вучоных, якія ўнясլі вялікі ўклад у гісторыю Беларусі, Польшчы, Расіі, Амерыкі, Францыі, Германіі, Чылі, Аўстраліі і іншых краін свету.

**Вучань 2:** Сярод іх Францыск Скарына, Ефрасіння Полацкая, Леў Сапега, Мікола Гусоўскі, Андрэй-Тадэуш Касцюшка, Агінскі, Адам Міцкевіч, Станіслаў Манюшка.

**Вучань 1:** Сярод беларусаў з паходжання Фёдар

Дастаеўскі, Аляксей Твардоўскі, Аляксандр Грыбаедаў, балерыны Азарэнічы, Мусаргскі, Стравінскі, Шастаковіч.

**Вучань 2:** Гэта Беларусь дала свету такіх славутых мастакоў, як Марк Шагал, Малевіч, Пэн, канструктараў Паўла Сухога, Барыса Кіта.

**Вучань 1:** І ці мала хто вымушан быўуцякаць ад пятлі, ад кулі. Ці нават проста ад немагчымасці выявіць сябе на Радзіме.

*Гучыць інструментальная мелодыя Ф. Папетті «Л'ете індіен (Афрыка)». На яе фоне чытаецца тэкст.*

**Хлопчык 1.** Чылі. Хрыбет Дамейка, горад Дамейка, у гарах — мінерал Дамейкіт, у акіяне — ракушка навуцілус- дамейкус, на зямлі — фіялка дамейкіяна. Гэта ў гонар Ігната Дамейкі (1801-1889 гг.), уражэнца маёнтка Нядзветка, што пад Мірам. Сябар Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Томаша Зана, стрыечны брат Марыі Верашчакі — першага кахання Міцкевіча.

Ён пасля разгрому паўстання 1830 г. вымушаны быў уцячы за мяжу.

Парыж. Кантракт з Чылі. Лекцыі па хіміі і мінералогіі ў г. Какімба. Адкрыў жыхарам Чылі, што такое салетра, для чаго яна прыдатная, адкрыў залежы медзі і срэбра. Пасля ён — прафесар у Сант'яга. Распрацоўвае і ажыццяўляе школьную рэформу, падарожнічае сярод напаўдзікіх араўконцаў, робіцца іх сябрам, бароніць іх. Чатыры тэрміны Дамейка перавыбіраецца рэктарам універсітэта. Ён бацькачылійскай навукі, рэарганізатар прамысловасці, навучання. Пасля смерцІ ён абвешча- ны нацыянальным героем Чылі.

**Хлопчык 2:** Можа для каго будзе і адкрыццем, што менавіта з Беларусі ў Расіі прыйшло прафесійнае тэатральнае і музычнае мастацтва. Гэта балерыны Азарэвічы заснавалі там балетную школу. Хочацца, каб вы цяпер адчулі атмасферу тых часоў.

*Выконваецца танец на музыку І.С. Баха «Менуэт».*

*Музычная застаўка. Выходзіць вядучы.*

**Вядучы:** Наступная старонка часопіса «Беларусь і экалогія».

*Гучыць інструментальнаямелодыяМ. Лапарцера «Мон ссеур естун втлон» (ледзяшы), на яе фоне гучыць верш.*

**Хлопчык 3:**

Ёсць на зямлі вялікі дом,
Пакрыты сінім дахам,
Жывуць там сонца, дождж і гром,
Вавёрка з вольным птахам.
Жывуць там луг і лес густы,
Мурашкі з матылькамі.
Жывеш у доме светлым ты
З бацькамі і сябрамі.

Вы ўжо здагадаліся, што размова пойдзе пра прыроду нашай Беларусі.

Гучыць інструментальная музыка Поля Марыа «У свеце жывел». Тушыцца святло, паказваюцца слайды «Прырода Беларусі», «Птушкі». На гэтым фоне чытаецца тэкст.

**Вядучы 1:** Здзіўляюць сваёй першароднасцю Белавежа і Бярэзіна, Нёманскі край і Палессе. Плывуць рэкі вялікія і малыя, ззяюць блакітам азёры. Тут і волат-зубр, і дробная мурашка. На Радзіму з далекага выраю вяртаюцца вясною буслы. Не вабяць іх заморскія дзівосы, спяшаюцца нашы разумныя, белакрылыя птахі ў родныя мясціны.

*Гучыць сумная музыка. На яе фоне чытаецца верш В. Іпатавай «Чарнобыль».*

**Хлопчык:**
Хата. Стогадовы дуб. Крыніца.
І буслы, зляцелыя здаля.
«Чалавек, дазволь нам пасяліцца.
Наймілей нам гатая зямля».
Расчынялі дзюбкі бусляняты.
Адпаузалі гады ў лаўжы.
І кружылі радасна над хатай,
Як заслон два белыя крыжы.
Моц набрала лета сакаўное.
Сонца, як расплаўленая ртуць.
Толькі дзеці хворыя абое
Ад гнязда ніяк не адлятуць.

*Высвечваецца слайд «Адзінокае сухое дрэва». Гучыць сумная музыка, на яе фоне чытаецца тэкст.*

**Дзяўчынка:** Чарнобыль... Чорны боль... Калючы дрот. Змрочныя аб’явы. Забароненая зона.

**Хлопчык:** Зямля, на якой нельга сеяць, вада, якую нельга піць, паветра, якім нельга дыхаць.

**Дзяўчынка:** Хворая мая зямля, бо па ёй прайшоў Чарнобыль. Хворая яшчэ і таму, што бяздушна ўладарыць чалавек на ёй.

**Хлопчык:** І мялеюць, забруджваюцца нітачкі-рэкі і вочы-азёры, няшчадна высякаюцца лясы, асушваюцца балоты.

**Дзяўчынка:** Хто ўратуе?

**Хлопчык:** Хто абароніць?

*Гучыць песня на словы Н. Гілевіча «Я — беларус».*

**Заключнае слова настаўніка:**

— Вось і загорнута апошняя старонка часопіса. Але перад вамі адкрыты ўсе дарогі і сцежкі нашай Радзімы.

Любіце нашу святую зямлю адцана і да канца. Іншае вам не дадзена, ды і не патрэбна!

# МЫ, НАРОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Сцэнарый выступлення ЛПГ*

*Мы, народ Рэспублікі Беларусь : сцэнарый выступлення ЛПГ // Папка “Краязнаўства. Святы дзяржавы, вобласці”, 2005 г.*

*Сцэнарый можа быць выкарыстаны для выступлення ЛПГ у розных аўдыторыях. Асабліва карысным будзе правядзенне такога мерапрыемства для моладзі. Выступленне можа быць прымеркавана да Дня Канстытуцыі, Дня Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Для правядзеннямерапрыемства неабходны 2 вядучых і некалькі чытальнікаў.*

**Вядучы 1:** Айчына - адзіная унікальная для кожнага чалавека радзіма, дадзеная яму лесам, завешчаная яго нашчадкамі, Паняцце “Радзіма” мае для нас некалькі значэнняў: гэта і вялікая краіна з вялікай гісторыяй, гэта і тое месца, дзе чалавек нарадзіўся і рос, дзе знаходзяцца магілкі яго продкаў, дзе ён пазнаў свае першыя радасці і няўдачы.

**Вядучы 2:** Невыпадкова ў цяжкія хвіліны свайго жыцця людзі ўспамінаюць месца, дзе нарадзіліся, дзе прайшло дзяцінства, другімі словамі сваю маленькую радзіму як частку вялікай Айчыны. Немагчыма забыцца пра той кут, дзе ты нарадзіўся, які спаўна абдарыў цябе мовай, цеплынёй і светам чалавечых адносін. Як бы ні склаўся лёс, куды б ні занеслі дарогі, заўсёды з удзячнасцю і пяшчотай будзем успамінаць сваіх аднавяскоўцаў, сцяжынкі дзяцінства, тую старонку, дзе неба здаецца вышэйшым, а далягляды шырэйшымі.

**Чытальнік:** Радзіма пачынаецца з двароў
Дзе журавель тырчыць, нібыта дрэўка.
Радзіма пачынаецца з вятроў.
Што падказалі першую запеўку...
Радзіма пачынаецца з вайны,
Што чвэрць народа некалі скасіла...
Яна - з тае ўсвядомленай цаны.
Што сам дасі лісточку дзівасіла...
Хвалююся - і ведаю, чаго:
Хачу, каб помніў суайчыннік кожны:
Радзіма пачынаецца з таго.
Што не набыць, а толькі страціць можна.

*(Е. Лось. Радзіма пачынаецца з двароў)*

**Вядучы 1:** Самыя важныя прынцыпы росквіту беларускай зямлі закладзены ў Канстытуцыі і ў сімволіцы яе дзяржаўнасці. 15 сакавіка 1994 года Вярхоўны Савет рэспублікі Беларусь прыняў новую Канстытуцыю -

Асноўны закон Рэспублікі Беларусь. Згодна з ёю, Беларусь з’яўляецца унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай, якая валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі. Канстытуцыяй у рэспубліцы ўведзена прэзідэнтская форма кіравання.

**Вядучы 2:** Прыняцце на ўсенародным рэферэндуме 1996 года новай рэдакцыі Канстытуцыі з'яўляецца пачаткам адліку новай эпохі ў жыцці нашай дзяржавы. Яна ўвасобіла ў сабе вопыт шматгадовага гістарычнага шляху Беларусі.

**Вядучы 1:** Канстытуцыйны парадак - гэта падмурак стабільнасці і грамадзянскай згоды ў краіне.

**Вядучы 2:** Асноўны Закон нашай дзяржавы гарантуе кожнаму чалавеку свабоды і правы, неабходныя для працы, дастойнага жыцця і гарманічнага усебаковага развіцця асобы.

**Вядучы 1:** Жыццё не стаіць на месцы. Яно прад'яўляе новыя патрабаванні. Сёння неабходна далейшая кансалідацыя ў грамадстве, паўсюдны клопат аб дабрабыце кожнай сям’і, адказнасць за спакойнае будучае нашых дзяцей.

**Вядучы 2:** Сучасная Беларусь як самастойная, незалежная і суверэнная дзяржава ідзе наперад па шляху сацыяльна-эканамічнага развіцця. Шмат чаго яшчэ трэба зрабіць. Народ рэспублікі Беларусь верыць, што канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян заўсёды будуць служыць умацаванню беларускай джяржаўнасці і міжнароднаму аўтарытэту Беларусі.

**Вядучы 1:** Для кожнай краіны Канстытуцыя - важнейшы атрыбут дзяржавы, сімвал яго дастоінства і гонару. Таму паважаць Асноўны Закон азначае паважаць сваю краіну, паважаць саміх сябе. Неабходна заўсёды памятаць аб гэтым, бо толькі пачуццё самапавагі дазваляе нам адчуваць сябе свабоднымі грамадзянамі нашай Беларусі.

**Вядучы 2:** 14 мая 1995 года шляхам рэспубліканскага рэферэндума быў ўстаноўлены новы Дзяржаўны сцяг і Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь.

**Вядучы 1:** На працягу доўгіх гадоў джяржаўная сімволіка мянялася.

**Вядучы 2:** Вакол нас - цудоўны свет! Задумайцеся над тым, што ўсё ў ім мае сваё імя: Іван, Ганна, горад... Кожнае слова, якім мы карыстаемся, створана для нас нашымі продкамі. Нават кароткае слова часам азначае так шмат, што цяжка выказаць і ў доўгай прамове: мама, дзядуля, сад, раніца... Слова - гэта як бы знакі ці сімвалы. Чым больш слоў ведае чалавек, тым багацейшая яго мова, тым паўней і глыбей здольны ён спасцігаць сэнс падзей.

**Вядучы 1:** Знакамі ці сімваламі запоўнена ўсё наша жыццё. Нават імя і прозвішча - гэта сімвалы, якія раскрываюць змест сваеасаблівага, непаўторнага лёсу. Францыск Скарына, Максім Багдановіч, Янка Купала, Пётр Машэраў - гэтыя імёны ажыўляюць у памяці таленавітых і знакамітых людзей, якія шмат і плённа напрацавалі на карысць Айчыны.

**Вядучы 2:** У далёкім мінулым людзі, якія жылі разам, утваралі роды і

плямёны. Роды і плямёны, якія не змаглі захаваць вопыт продкаў, загінулі - аслабелі і растварыліся ў іншых плямёнах. Тыя ж роды і плямёны, у якіх з павагай ставіліся да запаветаў і культуры продкаў, паспяхова развіваліся.

**Вядучы 1:** Роды і тым больш плямёны адрозніваліся сваім адзеннем. Яны будавалі асобныя тылы жылля, выраблялі своеасаблівыя хатнія рэчы, пакланяліся сваім героям, сваім багам. Людзі багатварылі крыніцы чыстай вады, пагоркі і т.д.

**Вядучы 2:** Нашым продкам выпадала адстойваць свабоду і незалежнасць ад шматлікых ворагаў, якія не жадалі араць і сеяць, не жадалі мірна рацаваць, а хацелі захапіць багацці, створаныя чужой працай. У жорсткіх бітвах трэба было дакладна адрозніваць сваіх ваяроў ад няпрошаных прышэльцаў. Для гэтай мэты рабілі асобай формы і асобай афарбоўкі шчыты, асобыя віды зброі.

**Вядучы 1:** Неабходнасць неяк адзначыць свае палкі, выдзеліць іх і адначасова запалохаць ворагаў, падбадзёрыць сваіх воінаў прывяла паступова да стварэння сцяга, шчыт жа вядома ператварыўся з цягам часу ў герб. Сцяг стаў знакам, які сведчыў аб прыналежнасці войска, горада, замка ці карабля да лзўнай краіны, пэўнай дзяржавы. Герб стаў знакам, які сведчыць аб радавітасці караля ці князя. Пазней герб правіцеля пачаў выкарарыстоўвацца ў якасці галоўнага сімвала дзяржавы.

**Вядучы 2:** Герб і сцяг лічыліся і лічацца ва ўсіх краінах вышэйшымі сімваламі народа. Ім ужо не пакланяюцца, але іх па-ранейшаму шануюць, як роднае слова, родны дом, родную культуру і звычаі. Яны сімвалізуюць, увасабляюць для кожнага чалавека, для кожнага грамадзяніна яго радзіму.

**Вядучы 1:** Наша краіна, наша дзяржава называецца Рэспубліка Беларусь. Вось як выглядае сучасны герб нашай дзяржавы *(дэманструецца герб РБ).*

**Вядучы 2:** Дзяржаўны герб уяўляе сабой сярэбранае проле. У якім размешчаны зялёны контур Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі, накладзены на залатыя промні ўзыходзячага над зямным шарам сонца. Уверсе поля знаходзіцца пяціканцовая зорка. Поле абрамлена вянком з залатых каласоў, пераплеценых справа кветкамі канюшыны. злева - кветкамі льну. Вянок тройчы перавіты з кожнага боку чырвона-зялёнай стужкай, у сярэдняй частцы якой. у аснове герба, напісана ў два радкі золатам: “Рэспубліка Беларусь”.

**Вядучы 1:** Зялёны контур тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у залатых промнях узыходзячага сонца гавораць аб тым, што ўсе свае думкі грамадзяне скіроўваюць да Айчыны - гэта наша зямля, нам чужой не трэба, але сваей мы не аддадзім ні пядзі. Мы захаваем яе ў тых межах, у якіх яна нам перададзена папярэднімі пакаленнямі, зробім магутнай і квітнеючай дзяржавай. Вянок з каласоў, пераплецены кветкамі канюшыны і кветкамі льну - сімвал памяці і непарыўнасці сувязі сучаснікаў з продкамі. Вянок, утвораны з пучка жыта, са старадаўніх часоў меў свяшчэнны сэнс для ўсіх славянскіх народаў. Славяне верылі, што пучок або сноп хлебных

каласоў - самы дастойны спосаб звароту да божых сіл з просьбай аб пасланні ці дараванні новага ўраджаю і працвітання.

**Чытальнік:** Жаворонки в выси голубой,
А вокруг широкое раздолье,
Лошадей веду на водопой,
Мимо созревающего поля.
Задержался взгляд на васильке -
Синем угольке во ржи озимой -
И запели о родном цветке
Строки Богдановича Максима.
Пас коней и слушал соловья,
И хоть рос во времени суровом,
Всё ж овеяна душа моя
Нежно-нежно клевером медовым,
День зажинок, обнажив стерню,
Пятки щекотал, а не колосья.
С давней той поры в себе храню
Солнцем озарённые колосья.
Наплывает ласково в глаза -
Память в прошлом трепетно увязла -
В молодых руках отца - коса,
На плече у мамы - перевясла.
И за дымкой невозвратных дней.
Накануне каждой косовицы.
Вижу лики близких мне людей,
Добрые, улыбчивые лица,
А услышу слово о гербе,
В несмолкаемом многоголосье,
В поле зренья сами по себе,
Возникают солнце и колосья.
Золотятся спелые хлеба...
Возродимся, счастье улыбнётся...
Лучше нет, пожалуй, для герба
Ничего, чем колоски и солнце!

**Вядучы 1:** Канюшына - гэта сімвал сувязі са стваральным светам жывёл: канем, каровай, авечкай, для якіх канюшына - лепшы корм. Старажытны ялюдзі справядліва лічылі, што чалавек - частка ўсяго свету жывых істот, якія здольны захаваць сабе жыццё і забяспечыць працвітанне толькі пры ўмове захавання і працвітання астатняга жывёльнага свету.

Лён - гэта бавоўна поўначы, цудоўны і заўсёды модны матэрыял для адзення. Здаўна з ільну выраблялiся прыгожыя і трывалыя тканіны. Лён – сімвал пераўтваральнай працы. Знак дабра і дастатку. Хто з нас не ведае гэта глыбока  - глыбока народнае “Ой, сэрца, лянок, мая радасць ты, ляянок..." *(Гучыць у запісу гэта народная песня).*

**Вядучы 2:** Зямны шар - гэта знак таго, што Рэспубліка Беларусь успрымае усе народы Зямлі як раўнапраўных сяброў і партнёраў. гатова з імі дружыць і гандляваць, абменьвацца вырабамі і ведамі. Зямля ў промнях сонца - вера ў вечнасць жыцця. Пяціканцовая зорка - сімвал чалавека і чалавецтва, знак мужнасці і высокіх памкненняў.

**Вядучы 2:** Такім чынам, герб нашай краіны раскрывае сябе як яркі і запамінальны аповед пра беларускі народ. У гербе адлюстраваны асноўныя нацыянальныя духоўныя каштоўнасці беларусаў: грамадзянскае адзінства, праца, імкненне да ўдасканалення сваей асобы і ўсяго грамадства, міралюбства і адначасова гатоўнасць пастаяць за сваю свабоду і суверэннасць.

**Вядучы 1:** Герб РБ сімвалізуе дзяржаўную волю народа і выкарыстоўваецца ўсімі дзяржаўнымі органамі краіны. Герб упрыгожвае ўрадавыя ўстановы, падцвярджаючы іх паўнамоцтвы. Усе важнейшыя дакументы і пячаткі ўтрымліваюць выяву Дзяржаўнага герба.

**Чытальнік:** Излучает он чудесный свет,
У него - высокая судьба,
И, пожалуй, в целом мире нет
Благородней нашего герба.
Не гривастый лев и не орёл,
И не рыцарь, вскинувший клинок,-
Утреннего солнца ореол,
Из колосьев и цветов венок.
Гармонично сочетается герб,
Воедино сопрягает он
Солнце и колосья, свет и хлеб,
Человеком чтимый испокон.
Хлеб - основа... А для красоты -
Медоносный клевер, васильки.
Не из них ли - хороши цветы -
Вьют у нас купальские венки!
В ярких, выразительных тонах -
Колоски, цветы родных полей.
В толстых геральдических томах,
Нет герба красивей и светлей.
И как этот герб, из года в год,-
Взор лаская, душу веселя,-
Пусть цветёт, чтоб в счастье жил народ,
Наша белорусская земля!

*(Бронислав Спринчан)*

**Вядучы 1:** Дзяржаўны сцяг адлюстроўвае істотна важныя звесткі пра нашу краіну. Кожны грамадзянін павінен добра разумець мову беларускага сцяга, каб асэнсавана шанаваць сцяг і ганарыцца ім, як ганарыцца сваім народам і яго слаўнай гісторыяй.

**Вядучы 2:** Наш сцяг мае тры колеры: чырвоны, зялёны, белы. Чырвоны колер са старажытных часоў служыць знакам Сонца, сімвалізуе кроўныя повязі, брацтва, барацьбу за справядлівую справу. Ён азначае высокае прызначэнне ў лёсе і перамогу. Адначасова гэта знак шчаслівага жыцця. Зялёны колер - гэга колер Прыроды, нашай карміцелькі, нашай першамаці. Гэта колер палёў і лясоў, якія здаўна займалі асноўную частку тэрыторыі нашай краіны. Зялёны колер - колер дабра, росту, развіцця, дабрабыту і міру. Беларускі паэт В. Дубаўка так захапляўся сваёў цудоўнай Радзімай

**Чытальнік:** О Беларусь, мая шыпшына,
Зялёны ліст, чырвоны цвет!
У ветры дзікім не загінеш,
Чернобылем не зарасцеш.
Пялёсткамі тваімі стану,
На дзіды сэрца накалю.
Тваіх вачэй, пад колер сталі,
Праменне яснае люблю.
Варожасць шляху не зачыніць:
У перашкодах дух расце.
О, Беларусь, мая шыпшына,
Зялёны ліст, чырвоны цвет!

**Вядучы 1:** Белы колер - гэта перш за ўсё колер свабоды. Недарэмна лічаць, што назва нашай краіны - Беларусь - звязана з непахіснай воляй народа да свабоды. Разам з тым белы колер - гэта колер маральнай чысціні і мудрасці. І гэтыя якасці павінен свята захоўваць у сваей душы сапраўдны сын беларускай зямлі.

**Вядучы 2:** Сцяг Беларусі мае яшчэ адну важную, характэрную рысу яшчэ адну важную дэталь - гэта чырвоны народны ўзор, ці, інакш кажучы, арнамент. Са шматлікіх варыянтаў беларускага народнага арнаменту на Дзяржаўным сцягу РБ адлюстравана частка найбольш старажытнага арнаменту. Работа была выканана ў 1917 годзе і належыць простай сялянцы Матроне Маркевіч з вёскі Касцелішча Сенненскага павета.

**Вядучы 2:** Што ж азначае гэты арнамент? Што ён сімвалізуе?

**Вядучы 1:** Перш за ўсё - працалюбства і працоўнае майстэрства як передумову ўсякага шчаслівага лёсу. Інакш кажучы, выражае самыя істотныя якасці народа і як бы моліць нябесныя сілы захаваць гэтыя якасці: пазбавіўшыся гэтых якасцеё, як народ, так і асобны чалавек губляюць права на дастойнае існававнне. Такім чынам, беларускі сцяг расказвае гісторыю беларускага народа ў яе самых сутнастных рысах, заклікае да ажыццяўлення самых высокіх імкненняў да свабоды, росквіту і дружбы народаў

**Чытальнік:** Ливнем вымытыя нивы,
Осенённые рассветом,-
Сочетается счастливо
Цвет зелёный с красным цветом.

Полыхание восхода,
Всходы - полосою узкой, -
Соткала сама природа
Флаг державы Белорусской,
Разве довод мой не весок:
На весеннем кругозоре -
И заря и перелесок,
И берёзы белокорье -
Розовый узор и млечный -
Красок радостная спевка -
Как орнамент наш извечный -
Красно-белый возле древка!
И к тому же у Дубовки
Цвет червонный, лист зелёный -
Образ яркий и глубокий,
Вещим сердцем окрылённый.
Дорогого мне поэта
Мог ли я не вспоминать, если
Два его любимых цвета,
На полотнище воскресли.
И в светающей Отчизне,
Осенив родные дали,
Символами вечной жизни,
На ветру затрепетали!

**Вядучы 2:** Сцяг лунае над будынкам у якім працуе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Сцяг пастаянна ўзняты і над будынкамі іншых важнейшых дзяржаўных установ. Сцяг РБ маюць усе выканаўчыя ўлады раёнаў і абласцей, усе установы, прадпрыемствы, воінскія часці, арганізацыі і навукова-даследчыя інстытуты. Беларускі сцяг падымаецца ў час спартыўных спаборніцтваў у Рэспубліцы Беларусь і за яе рубяжамі. Сцяг ад'ядноўвае нас, азначае наша адзінства і агульную волю.

**Вядучы 1**: І ў час суровых выпрабаванняў сцяг Айчыны заставаўся сімвалам мужнасці і непахіснай волі народа да перамого над ворагам.

**Вядчы 2:** Сцяг роднай краіны аберагаюць ад любой знявагі. Выратаванне сцяга ў баявых умовах лічыцца доблесным, гераічным учынкам. Страта сцяга воінскім падраздзяленнем азначае, што яно расфарміравана.

**Вядучы 1:** Герб і Сцяг рэспублікі Беларусь утвараюць гарманічнае сэнсавае адзінства і азараюць наша жыццё ад нараджэння да смерці.

**Вядучы 2:** Цяперашні Герб і Сцяг прыняты ў выніку ўсенароднага галасавання 14 мая 1995 года. Высветліць народную думку адносна Сцяга і Герба прапанаваў першы беларускі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

**Вядучы 2:** Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка нарадзіўся 30 жніўня 1954 года ў гарадскім пасёлку Копыль Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Ён закончыў гістарычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута і

Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Па адукацыі наш Прэзідэнт настаўнік гісторыі і грамадазнаўства, эканаміст аграпрамысловай вытворчасці. Да моманту абрання Прэзідэнтам ён меў багаты вопыт работы ў вытворчых калектывах, у арміі і Парламенце нашай краіны.

**Вядучы 1:** Гімн беларускай джяржавы, мабыць. самы хвалюючы кожнае сэрца сімвал краіны

**Вядучы 2:** У конкурсе прынялі ўдзел многія вядомыя паэты и кампазітары. Але аказалася, што лепшай музыкі, чым мелодыя Гімна Беларускай ССР, якую сачыніў Нестар Фёдаравіч Сакалоўскі ніхто не стварыў. Паэт Уладзімір Іванавіч Карызна, лірык і песеннік. лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, атрымаў перамогу у конкурсе: ягонаму тэксту гімна, у якім былі выкарыстаны фрагменты ранейшага тэксту гімна, напісанага Максімам Мікалаевічам Клімковічам, журы аддала перавагу. *(Гучыць гімн РБ).*

**Вядучы 1:** Зямля мая, родная Беларусь! Усё у цябе дзівоснае, усё поўніцца высокім сэнсам, і лёс твой - у тваіх уласных руках, у мудрасці і мужнасці тваіх грамадзян, у іх адказнасці, салідарнасці і агуртаванасці перад агульнымі цяжкасцямі гістарычнага шляху.

**Вядучы 2:** Кожны, хто імкнецца самастойна спасцігнуць вялікую сутнасць паняцця. Мая бацькаўшчына, павінны скіраваць свой позірк да Канстытуцыі, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага флага - праменяць яны вялікую сілу і дабрыню народа, яго непахісную надзею і веру.

**Чытальнік:**

Ідзём мы вернаю дарогай,
Ірдзяцца зоры нашых дзён,
Бо нам прастору, волі многа,
І ўсё шырэе даль-разлога,
І ўсё дужэе наш разгон.

**Вядучы 1:** Гэтэк успрымаў народны песняр Беларусі Якуб Колас гістарычны поступ беларускай зямлі. Няхай вечна лунаюць над ею слаўныя сімвалы нашай суверэннасці і свабоды.

# ГАНАРУСЯ ТАБОЙ, БЕЛАРУСЬ!

*Сцэнарый свята для першакласнікаў*

*Ганаруся табой, Беларусь! : сцэнарый свята для першакласнікаў па выніках работы з кнігай“Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку” // Папка “Краязнаўства. Святы дзяржавы, вобласці”, 2005 г.*

*Пад гукі музыкі на сцэну выходзяць вядучыя:*

**Вядучы:** Неба чыстае і глыбокае
І бярозавы ціхі гай,
Беларусь мая сінявокая,
Беларусь мая — родны край!
У густых садах ты красуешся,
Сілай поўная маладой.
У агнях уся ярка свецішся,
Разліваешся збажыной.
Славай слаўная ты быліннаю,
Залатою сваёй красой,
Майскай песняю салаўінаю
І вясёлкамі над ракой.
**Вучаніца:** Неба чыстае і глыбокае...
**Вучань:** І бярозавы ціхі гай...
**Разам:** Беларусь мая сінявокая,
Беларусь мая — родны край!

*У. Карызна*

*Паступова музыка сціхае.*

**Вядучы:** Дарагія сябры! Сёння мы павядзём размову аб самым галоўным, самым каштоўным — аб нашай Бацькаўшчыне.

Рака пачынаецца з ручаін. Дрэва мае карані, а чалавечая годнасць і вартасць нараджаюцца з глыбокай адданасці сваёй Радзіме, з пашаны да яе спадчыны, з ведання сваёй гісторыі, з любові да матчынай мовы. Гэта самыя неабходныя ўмовы, каб людзьмі між людзей пачувацца.

*Ансамбль выконвае песню “Цымбалістка” (словы У. Скарынкіна, музыка У. Будніка).*

Пра беларускі родны край
Сыграй мне песню, цымбалістка.
Сыграй пра ўсё., што сэрцу блізка,
Пра ўсё, што дорага, сыграй.
Мне вельмі хочацца ўлюбёна
Ізноў зірнуць на дзве рукі,
Што над цымбаламі натхнёна

Трапечуцца, як жаўрукі.
Няхай нашчадкі ўсе Купалы
Сны сонечныя сняць.
Хай нашы беларускія цымбалы
Весела звіняць.
*Выходзяць вучань і вучаніца XI класа.*

**Вучаніца:** Дарагія першакласнікі! 1-га верасня, у Дзень ведаў, на ўрачыстай лінейцы мы ўручылі вам ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь падарунак — кнігу “Беларусь — наша Радзіма”. У нашага Прэзідэнта шмат важных спраў. Але ён помніць пра Вас, першакласнікі. У сваім звароце, змешчаным на першай старонцы, ён выказвае надзею на тое, што вы зробіце ўсё, каб стаць сапраўднымі грамадзянамі сваёй Айчыны.

**Вучань:** Белая Русь... Гэта назва гучыць для нас ціхім шолахам лісця ў лесе, вясёлай гаворкай крынічкі ў полі, развітальным курлыканнем журавоў высока ў небе, шумным гоманам дзятвы, блішчыць расінкай у промнях узыходзячага сонца. Усё гэта яна — Белая Русь.

**Вучаніца:** Кажуць, ёсць краіны-цуды,
Дзе зусім няма зімы.
Мы ж не рвёмся анікуды,
Любім свой куточак мы.

*Гэта кніга дапамагла нам паглыбіць свае веды пра нашу краіну. Ставяць кнігу на падстаўку. Пакідаюць сцэну.*

*Выходзяць вучань і вучаніца —першакласнікі. Становяцца па абодва бакі ад падстаўкі, на якой змешчана кніга.*

**Вучань:** Я нарадзіўся беларусам,
Беларусам буду жыць!
Мову родную вучуся
Шанаваць, цаніць, любіць.
Сваю родную старонку
Я люблю, як і бацькоў,
Што вучылі песні звонкай,
Прывівалі мне любоў
І да мовы, да дубровы,
Да палёў і да лугоў,
І заўсёды да народа,
Што жыве тут ад вякоў.

*В. Швед*

**Вучаніца:** Я — дзяўчынка-беларуска
З васільковымі вачыма.
Хоць малая, але знаю:
Беларусь — мая Радзіма...
Васількі ў светлым жыце,
Вербы ніцыя над Сожам.
Беларусь: Бярэсце, Свіцязь,

Налібокі і Каложа...

*Л. Пранчак*

*Выходзяць два вучні і дзве вучаніцы — першакласнікі. Становяцца па абодва бакі ад падстаўкі. У руках — плакаты з літарамі.*

**І -ы вучань:** Куды ні глянь — лясы шумяць,
Цвіце над полем гай,
А поле — вокам не абняць,
І гэта ўсё — мой край!
**1-я вучаніца:** Пшаніца, жыта на палях,
Усюды ўраджай,
Стагі як горы на лугах,
І гэта ўсё — мой край!
**2-й вучань:** Жыве, працуе наш народ
Ці ў снежань, ці ў май.
І харашэе з года ў год
Мой родны, вольны край!
**2-й вучаніца:** Куды ні глянь — лясы шумяць.
Цвіце за полем гай.
А поле — вокам не абняць,
І гэта ўсё — мой край!

**Настаўніца.** Наш край, Айчына, Бацькаўшчына, родны кут! Усё гэта называем мы адным словам...

Дзеці *(разам)*. ***<u>Радзіма!</u>***

*Дзеці падымаюць плакаты, атрымліваецца слова "Радзіма". Вядучы прымацоўвае плакаты да сцяны, ніжэй змяшчаецца карта Беларусі.*

*Цымбалісты выконваюць твор І. Лучанка* **"Мой родны кут".**

**Вядучы:** *(паказвае указкай).*
На карце вялікага свету
Яна як кляновы лісток,
Песня гарачага лета,
Крынічнай вады глыток.
Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой.
Твой родны край, твая Айчына —
Жыццё тваё і гонар твой.

*Ю. Свірка*

*Музыка сціхае.*

**Вядучы:** Рэспубліка Беларусь — незалежная суверэнная дзяржава. Як і ўсе незалежныя дзяржавы, Беларусь мае дзяржаўныя сімвалы — герб, сцяг, гімн.

*Гучыць Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь. Усе спяваюць стоячы*!

*Да мікрафона выходзяць вучаніцы — удзельніцы ансамбля.*

**1 -я вучаніца:** Ішла я скрозь поле,

Між вечных дуброў
І трапіла раптам
У краіну майстроў,
У краіне той
Кожны працу шануе:
Хто шые, хто вяжа,
Куе ці майструе.

**2-я вучаніца:** У нашай краіне робіцца ўсё для лепшага жыцця: развіваюцца прамысловасць, сельская гаспадарка, адукацыя, медыцына.

*Выходзяць першакласнікі.*

**Вучань:** Ствараюцца добраўпарадкаваныя аграгарадкі.

**Вучаніца:** Пераехала ў новы будынак Нацыянальная бібліятэка.

**Вучань:** У кожным абласным горадзе пабудаваны палацы спорту.

**Вучаніца:** Нашы трактары, БелАЗы, МАЗы добра вядомы ў Кітаі, Індыі, Польшчы і іншых краінах свету.

**Вучань:** *(паказвае на дзяцей, якія вынеслі на сцэну кошык з бульбай, снапы жыта, ільну, ільняныя вырабы).*

Усяму вядомы свету
Наш руплівы край здавён.
Тут на сонечных палетках
Спеюць бульба, жыта, лён.

**Вучаніца:** *(паказвае цацачныя БелАЗ, трактар).*

Тут умельцы вырабляюць
Слаўны трактар "Беларус",
Тут ствараюцца БелАЗы —
Трохсоттонны везці груз.

**Вучань:**

Тут сыны ляцяць у космас,
Песні матчыны пяюць.
Гэты край наш найдзівосны...

**Дзеці:** *(разам).*

Беларуссю ўсе завуць!

*Выходзяць удзельнікі ансамбля і два першакласнікі.*

**Вучаніца:** Усё, што створана на беларускай зямлі, створана рукамі і розумам беларусаў, слаўных сыноў і дачок Беларусь і гэтыя рэчы, і мілагучныя песні, і цудоўныя вершы, казкі, паэмы і шмат чаго яшчэ.

**Вучань:** Беларускі край наш родны
Такі прыгожы і цудоўны.
Куды ні кінеш вокам —
Усё цвіце навокал.

**Вучаніца:** Чаму ж вясёлымі не быць,
Чаму ж нам не спяваць,
Калі наш край цвіце, расце,
Наўкол сцягі гараць!

*Ансамбль спявае беларускую народную песню* **“Кума мая, кумачка”** *(апр. А. Кавалёва), выконвае танцавальныя рухі, першакласнікі паўтараюць.*

Кума, мая, кумачка, Дзе жывеш?
Чаму мяне ў госцейкі Не завеш?
Ці ты, куме, розуму Пытаеш?
Ці ты маёй хатачкі Не знаеш?
А вунь мая хатачка Ля вады,
З высокага дзераўца, З лебяды.
Яшчэ к таму сенечкі Прыпляту,
З харошага дзераўца, З асоту.
Тады цябе ў госцейкі Пазаву,
Як свежае рыбачкі Навару.
А свежая рыбачка — Акунёк,
А любенькі госцічак — Мой кумок.

*Да мікрафона падыходзяць настаўніца дзяўчынка-першакласніца.*

**Вядучы:** Мы — народ Беларусь Мы жывём у Еўропе побач з іншымі народамі, у якіх свая гісторыя. Але перш за ўсё мы павінны ведаць наша мінулае — каб разумець, хто мы ёсць, адкуль ідзём і куды хочам прыйсці.

**Вучаніца.** Вялікая Айчынная вайна пакінула трагічны след у гісторыі краіны. Загінуў кожны трэці жыхар Беларусі. Вечна будзе жыць у нашых сэрцах удзячнасць тым, хто здабываў Перамогу!

*Ансамбль спявае песню У. Высоцкага “На братских могилах". На апошнім акордзе песні гучыць метраном. Усе схіляюць галовы. Хвіліна маўчання.*

**Вучань:** Именем солнца,
Именем Родины
Клятву даем!
Именем жизни
Клянемся павшим героям:
То, что отцы не допели...
**Усе:** Мы допоем!
**Вучань.**
То, что отцы не построили...
**Усе:** Мы построим!

**Вядучы:** Дзякуючы цудоўнай кнізе “Беларусь — наша Радзіма” вы бліжэй пазнаёміліся з нашай краінай. Утульны і чароўны край, гераічная і шматпакутная зямля, велічная, гордая Беларусь! Для кожнага яна пачынаецца з мамы і таты, бабулі і дзядулі, роднага дома... Сёння мы адгортваем апошнюю старонку кнігі — “Мой радавод”.

**1-ы вучань:** Над прасторай сінявокай Беларусі
Пралятаў з калыскай у дзюбе бусел.
Аглядаў лясы ён і палетак,
У калысцы нёс матулям дзетак.
Нас таксама ён прынёс на Беларусь,

Кожны з нас — патомны беларус.
Ведайце усе, я ганаруся
Тым, што нарадзіўся ў Беларусі!

**2-і вучань** *(падыходзіць да кампазіцыі “Куточак роднай прыроды").* Вось гэта мае продкі — дзядуля і бабуля маіх дзеда і бабулі. Я іх ніколі не бачыў, але думаю, яны выглядалі вось так *(паказвае падрыхтаваны малюнак залу, прымацоўвае на дрэве).* Вось гэта мае бабуля і дзядуля — бацькі мамы *(паказвае фотаздымкі, называв імя, імя па бацьку).* А гэта татавы бацькі *(паказвае фотаздымкі, называв імя, імя па бацьку).* Вось гэта мае бацькі: матуля *(імя, імя па бацьку),* тата *(імя, імя па бацьку).* А вось і я *(імя, прозвішча).* Я толькі адна маленькая галінка на гэтым дрэве — дрэве майго роду, маёй Радзімы... *(Бярэ бусліка, падымае вышэй.)* Зямлі пад белымі крыламі.

*Ансамбль спявае песню “Бацькаўшчына” (словы У. Караткевіча, музыка А. Мурашкі).*

Дагарэў за брамай небакрай,
Месяц паміж воблачкаў плыве.
Выйду зноў, як у мінулы май,
Басанож прайдуся па траве.
Лашчыцца трава да босых ног.
З дальніх паплавоў плыве ракой
Ледзь прыкметны сумны халадок —
Подых юні ўходзячай маёй,
Подых юні ўходзячай маёй.
Ціха цмокае у сне рака.
О, як добра, як прыгожа жыць!
Раска, як русалчына луска,
На вадзе ад месяца гарыць.
А вакол травіцы роснай рай
І бярозак белая сям’я.
Мой чароўны беларускі край,
Бацькаўшчына светлая мая!

*Падчас песні два першакласнікі выносяць глобус з выдзеленымі контурамі Беларусі. Дзеці разгортваюць ручнікі, ад глобуса расцягваюць рознакаляровыя стужкі.*

**Усе** *(гучна).*Ганаруся табой, Беларусь!

*Гучыць музыка ў выкананні аркестра. Дзеці падносяць падарункі гасцям, бацькам.*

## ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎ – ЗЯМЛЯ СВЯТАЯ

*Сцэнарый тэатралізаванага свята*

*Зямля бацькоў - зямля святая : сцэнарый тэатралізаванага свята // Папка “Краязнаўства. Святы дзяржавы, вобласці”, 2005 г.*

*На фоне музычнага суправаджэння паказваюцца прыгожыя краявіды Беларусі.*

**Вядучы:** Зямля Беларусі. Гожы, ласкавы, шчымліва непаўторны край. Сасновыя бары, шчодрыя і мудрыя ў сваёй задуменнасці, светлыя бярозавыя гаі, напоўненыя птушыным звонам, блакітныя азёры, што ўглядаюцца ў бязмежнае неба... Гэта наша Радзіма.

*На сцэну выходзяць дзяўчаты, збіраюць кветкі і плятуць вяночкі. Залятае бусел, кружыць па сцэне. Яму насустрач выходзіць хлопчык.*

**Хлопчык.** Бусел, бусел, клёка, клёка,
Дзе ты жыў?

**Бусел.** Я жыў далёка.
За гарамі, за лясамі.
Там, дзе Ніл, на поўдні самым.

**Хлопчык.** Як жа ты там, бусел, жыў?

**Бусел.** Я не жыў - усё тужыў.
Дзе б ні быў,
Дзе б ні лятаў -
Родны край успамінаў.

**Дзяўчынкі** *(паміж сабой):*
- Што такое Бацькаўшчына?
- Гэта рэчка, сцежачка лясная.
- Гэта ў лузе залатая пчолка.
- А ў вачах тваіх вясёлка.
- Гэта песні, што звіняць наўкола.
- Гэта тата твой і мама, і сябры твае таксама.

*Дзяўчаты сыходзяць са сцэны.*

*На фоне музычнага суправаджэння дэманструюцца кадры з фотаздымкамі старажытных кніг. На сцэне чатыры вядучыя.*

**1 вядучы.** Калі шануеш нашу мову,
Якую продкі збераглі,
Скажы на ёй такія словы,
Каб у вяках яны жылі.

**2 вядучы.** Каб той, хто прыйдзе за табою,
Не папракаў цябе ні ў чым,
А ўзяў бы мову, нібы зброю,

Каб для нашчадкаў зберагчы.

*(Ю. Свірка)*

**3 вядучы.** Бясследна нішто не міне,
Гісторыя слова адродзіць.
Ты - мост, па якім да мяне
Мінуўшчына ў госці прыходзіць.
**4 вядучы.** Мільгаюць старонкі твае -
І мы размаўляем з вякамі,
І продак да нас дастае
Радкамі, нібыта рукамі.

*(П. Макаль)*

**Настаўнік.** У X стагоддзі ўтварылася першая беларуская дзяржава - Полацкае княства. У гэты ж час узнікае на нашай зямлі і пісьменства. Нашы продкі, абараняючы сваю зямлю, беражліва захоўвалі традыцыі і мову. Першым князем старажытнай дзяржавы быў Рагвалод.

*На сцэну выходзіць Рагвалод з князёўнай Рагнедай.*

**Рагвалод.** Мілая мая дачка, вымушаны я зноў пакінуць цябе, каб абараніць зямлю нашу.

**Рагнеда.** Беражы сябе, мой родны тата, і не журыся - я за сябе пастаяць змагу, бо...

Навучыла жыццё волю светлую піць
І ніколі не знацца з прымусам.
Навучыла зямля, як Радзіму любіць,
Як любіць крывічан-беларусаў.

*(Л. Случанін)*

*Рагнеда і Рагвалод выходзяць.*

**Настаўнік.** Рагнеда - мужная, непакорлівая жанчына, якая любіла сваю Радзіму і мову. Яе сын Ізяслаў у зусім маладым узросце стаў Полацкім князем і праславіўся тым, што пры ім з'явілася ў Полацку першая на Беларусі школа.

*Выходзіць князь Ізяслаў і вучоны манах.*

**Ізяслаў.** Вось дошчачкі, пакрытыя воскам, а тэта пісапы. Дзяцей вучыце старанна. Грамату хай асвойваюць па царкоўных кнігах. І спачатку азбуку хай завучаць на памяць.

*Ізяслаў выходзіць, а ў гэты час на сцэну заходзяць хлопчыкі. Манах і дзеці кланяюцца князю. Дзеці садзяцца на лаву. Настаўнік раздав ім дошчачкі і пісалы (палачкі) і пачынае весці ўрок. Вучні паўтараюць за ім і запісваюць на дошчачках.*

**Манах.** Аз, букі, ведзі, глаголь.

**Настаўнік.** Ізяслаў стаў збіраць першую ў Беларусі бібліятэку. Кнігі перапісваліся ад рукі і каштавалі дорага. А перапісчыкаў вельмі паважалі і цанілі, бо праца іх была сапраўды цяжкая.

*На сцэне летапісец. У руках гусінае пяро. Піша.*

**Летапісец.** На чыстым аркушы прад вузенькім акном
Прыгожа літары выводжу я пяром.
Парой спынюся я, каб лепей завастрыць
Пяро гусінае, і гляну: светла сонца
Стаўпамі падае праз вузкае аконца.
І зноў схіляюся, застаўку я выводжу
Няяркім серабром.
Нячутна дзень праходзіць.

*(М. Багдановіч)*

*Выконваецца павольны танец.*
*Гучаць званы, на экране Сафійскі сабор.*

**1 вядучы.** Ад казак і песень у век хуткаплынны
Аб горадзе Полацку слава ішла,
Дзе жыў продак слаўны Францішак Скарына,
Што зоры пасеяў над роднай краінай,
Іскрыстыя зоры навукі, святла.

**2 вядучы.** Дзе позірк людзей і чысцюткі, і сіні,
Дзе плешчуцца хвалі паміж берагоў,
Дзе несла народу свайму Еўфрасіння
Ад шчырага сэрца цяпло і любоў.

**3 вядучы.** Дзе, верныя роднаму слову да скону,
Складалі радкі аб радзіме сваёй
Шматлікія вучні брата Сімяона,
Што Полацкім зваўся.
І што над Дзвіной
У школцы вучыў хлапчукоў-палачанаў.

**4 вядучы.** Знікаюць стагоддзі, праходзяць хвіліны,
Калі мы пачуем ад продкаў наказ:
Святой Еўфрасінні, Сімяона, Скарыны.
Увага!
На момант спыняецца час.

*У час чытання верша выходзяць Скарына, Еўфрасіння, Сімяон Полацкі.*

**Еўфрасіння.** Вось сабрала вас, нібы птушанятаў, пад крылы свае. Столькі гадоў праляцела над родным краем, столькі слаўных сыноў і дачок узгадавала міла зямелька!..Уславім жа навуку, асвету і край наш былінны.

**Скарына.** Я множыў слова, адліваў у шрыфце,
Па полі белым сыпаў, як з сяўні.
Патрэбна ж людзям столькі дабрыні,
Святла,
Прачыстай праўды з глыбіні
І мудрасці - без іх хто мы, скажыце?

*(М. Арочка)*

**Сімяон.** Муж дабраверны, царкве і дзяржаве патрэбны,

Роднаму Полацку славу хацеў я здабыць.
Шчыра звяртаўся ў малітвах адданых
Да Еўфрасінні, зямлячкі маёй мнагамудрай.
І да асветы радзімай зямлі беларускай.

**Еўфрасіння.** Слова роднае, кніга, пасеяная ў народзе, далі ўсходы паўсёй нашай любай зямельцы. Яго неслі людзям Кірыла Тураўскі, Васіль Цяпінскі, Сымон Будны, Пятро Мсціславец. (*Слайды)*

*Выконваецца песня «Спадчына».*

**1 вядучы.** Мудры запавет продкаў - захоўваць тое, што яны пакінулі нам у спадчыну. У першую чарту гэта мова.

**2 вядучы**. Давайце паслухаем, што сказалі пра мову нашы славутыя пісьменнікі.

*На экране з'яўляюцца словы пра родную мову. Вядучыя іх чытаюць.*

**3 вядучы**. Роднае слова - гэта першая крыніца, праз я кую мы пазнаём жыццё і акаляючь нас свет. *(Якуб Колас.)*

**4 вядучы**. Беларуская мова ласкавая, мілагучная, як песня.

*(Іван Мележ.)*

**3 вядучы**. Хто забыў сваіх продкаў - сябе губляе.
Хто забыў сваю мову - усё згубіў.

*(Уладзімір Караткевіч.)*

**2 вядучы.** Так, гэта мудрыя словы. А вось як адносяцца да роднай мовы дзяўчынкі і хлопчыкі, якія прыехалі ў «Зубронак»?

**1 вядучы.** Гэта зараз мы і ўбачым.

*Паказваецца загадзя створаны ролік. Вучань бярэ інтэрв'ю ў школьнікаў.*

*На сцэну выходзіць* ***Азбука*** *(высокая дзяўчына ў сукенцы з нашытымі на ёй літарамі). Услед за ёй выбягаюць* ***Літаркі*** *(маленькія дзяўчынкі і хлопчыкі. На грудзях у іх прышпілены розныя літары. У руках трымаюць шары, на якіх напісаны тыя ж самыя літары).*

*На авансцэну выходзіць* ***«А».*** *Ідзе і выхваляецца.* ***«У»*** *піхае яе.* ***«А»*** *плача:«А-а-а». Праходзіць важная* ***«О».*** ***«У»*** *тузае яе за валасы. Тая адскоквае і абурана вымаўляе «О!». Ідуць сяброўкі* **«Ы»** і **«І»** і *смяюцца: «Ы-ы-ы», «І-І-І»,* ***«У»*** *хоча падставіць ім нагу, піхае іх. Яны адыходзяць трошкі ўбок. Да* ***«А», «О», «Ы»,*** і **«І»** *падыходзіць* ***«Ў»,*** *супакойвае ўсіх.*

**«Ў».** Я не дазволю нікому вас крыўдзіць і буду з вамі заўсёды побач. *(Бярэ літары за рукі.)*

**Азбука.** Нам нельга сварыцца, мы павінны быць дружнымі, каб людзі маглі скласці прыгожыя словы. Паглядзіце, як модна сябруюць **«Д»** і **«З».**

**«Д».** Я — «Д».
**«З».** Я - «З», мы не сястрычкі.
**«Д».** Але сябруем мы здаўна.
**«З».** Як шчабятлівыя сінічкі,
**«Д».** Сакочам з ранку да цямна:
**«З».** Дзядуля, дзядзечка, знаходзіць,

**«Д».** Дзівак, дзяўчынка, дзякуй, дзень,
**«З».** Удзячны, дзінькае, прыходзіць,
**«Д».** Дзірван, адзенне, авадзень...
**Азбука.** А зараз пакажыце, што яшчэ вы ўмееце.

*Літары складаюць словы **«слова», «мова», «Беларусь»** і потым выбягаюць у залу. Яны становяцца ў праходах. Выконваецца вясёлы танец. Інсцэніруецца верш В. Гардзея «Мая граматыка». На сцэну выходзяць* **Назоўнік, Прыметнік, Займеннік, Дзеяслоў, Лічэбнік, Прыслоўе.**

**Назоўнік.** У лесе родную вучыў я мову,
Назоўнікамі дрэвы ў ім звіняць.
**Дзеяслоў.** Тут птушкі ўтвараюць дзеясловы -
Пяюць шчабечуць, свішчуць і крычаць.
**Прыметнік.** Прыметнікамі бор здалёк прыкметны -
Зеленачубы, статны, залаты.
**Займеннік.** Сустрэне бор займеннікам прыветным:
Як з лепшым сябрам, з кожным ён на ты.
**Лічэбнік.** Зязюля раніцой лічэбнік вучыць -
Плыве наўсцяж стосотае «ку-ку».
**Прыслоўе.** Хаваюцца часціцы і прыслоўі,
Нібы грыбы, сярод імхоў і траў.
**Прыметнік.** Я ў верасным, сунічным пасляслоўі
Граматыкі падручнік прагартаў.
**Прыслоўе.** Звіні ж вякамі, мова, па-над краем -
**Назоўнік.** На пераправе, улузе, пры сасне.
**Лічэбнік.** Жыццё не адмаўляе, а сцвярджае:
Адмоўная часціца мовы - не.
**Дзеяслоў.** Не знішчым мы, не страцім, не загубім
**Займеннік.** Сваіх азёр, лугоў, сваіх лясоў.
**Усе разам.** І родны край і мову не разлюбім -
У кожным сэрцы гэты дзеяслоў.

**1 вядучы**. Мы ўпэўнены, што ў гэтай зале шмат прыхільнікаў беларускай мовы.

**2 вядучы.** Безумоўна, самымі шчырымі захавальнікамі мовы з'яўляюцца пісьменнікі. З творчасцю многіх вы добра ўжо знаёмы. Зірніце на экран. З імем якога вядомага беларускага паэта асацыіруецца гэта расліна? *(Паказваецца колас.)* Правільна, з імем Якуба Коласа.

**3 вядучы.** Гэта было зусім лёгкае заданне. Якога паэта вы ўзгадалі, зірнуўшы на гэтыя кветкі? ***(На экране васількі.)*** Вядома ж, гэта Максім Багдановіч.

**4 вядучы.** А зараз яшчэ адно пытанне. Назавіце паэта. *(На экране папараць.)* Так, Янка Купала нарадзіўся ў ноч на Купалле, калі шукаюць папараць - кветку.

**1 вядучы.** А цяпер паглядзім, як вы ведаеце творчасць гэтых паэтаў.

**2 вядучы.** Адна частка залы будзе ўспамінаць радкі з верша Янкі

Купалы, другая – словы Якуба Коласа, а трэцяя - Максіма Багдановіча.

**3 вядучы**. Мы пачынаем чытаць радок, а вы працягваеце. Толькі зладжана і гучна.

**4 вядучы.** Увага! Ад прадзедаў спакон вякоў Мне засталася спадчына.

**1 вядучы.** Мой родны кут, як ты мне мілы,
Забыць цябе не маю сілы.

**2 вядучая.** І тчэ, забыўшыся, рука
Замест персідскага узору
Цвяток Радзімы васілька.

**3 вядучы.** А ці ведаеце вы, што 2008 год быў абвешчаны ЮНЕСКА годам Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, беларускага пісьменніка XIX стагоддзя?

*Паказваюцца кадры з кінафільма «Рамантык з Люцынкі»*

**Дзяўчына.** (*На фоне музычнага суправаджэння і паказу слайдаў пра Нарачанскі край чытае верш.)*

Край азёрны, чароўны мой край,
Нарач чайку на хвалях гайдае
І душы маёй кветкавы май.
Я кутка прыгажэй не згадаю.
Тут гасцінныя людзі жывуць,
Прыязджайце да нас, калі ласка,
Дабрыню і спагаду адчуць,
Пасябруйце з Нараччу-казкай.

**1 вядучы.** Нарачанская зямля гасцінна сустрэла нас, стала на нейкі час для нас другім домам. Давайце ж прывітаем яе шчырай песняй.

*(Песня «Нарачанка».)*

**2 вядучы**. Нарачанскі край - радзіма Максіма Танка. Пасля доўгіх вандровак ён заўсёды вяртаўся да берагоў Нарачы.

**3 вядучы.** Паслухайце, калі ласка, голас паэта.

*(Паказваюцца кадры з кінафільма «Пясняр з Нарачанскага краю».)*

**1 вядучы.** Максім Танк аддана любіў сваю малую радзіму. І мы ўпэўнены, што і вы шчыра любіце свой маленькі куток.

**2 вядучы.** Хто скажа некалькі слоў пра свае родныя мясціны?

**Бліц-інтэрв'ю.** Вядучыя спускаюцца ў залу і даюць магчымасць некалькім чалавекам коратка расказаць пра свой горад, пасёлак, вёску.

*Гучыць песня «Купалінка». Карагод дзяўчат. Слайды пра Купалле.*

**3 вядучы.** Наш народ заўсёды шанаваў трэдыцыі, захоўваў абрады. І сёння любімымі святамі застаюцца Купалле, Каляды, Гуканенне вясны.

*На сцэну выходзяць калядоўшчыкі. Яны вядуць з сабой Мядзведзя і Казу.*

**1 вядучы.** Беларускі народ знаходзіў заўсёды час як на навуку, так і на працу, а пасля – на песні, гульні і забавы.

**2 вядучы.** А зараз паслухаем, як выспяваеце беларускія песні. Правядзём невялікіконкурс.

*Гучыць фанаграма песень «Ручнікі», «Касіў Ясь канюшыну», «Бялявая-чарнявая...»*

**2 вядучы.** Дзякуй усім. Малайцы.

**3 вядучы.** Не забывайцеся на беларускія песні, пішыце свае, развучвайце беларускія танцы, гульні, прыказкі і прымаўкі, казкі і легенды.

**4 вядучы.** Далучыўшыся да сваёй культуры, вы самі станеце чысцейшымі, лепшымі і высакароднымі.

**1 вядучы**. Магчыма, вам якраз і здзейсніць
Дзядоў вялікіх запавет:
Узняцца так на крыллях песні,
Каб чуў і бачыў цэлы свет.

**2 вядучы**. Вы, відаць, звярнулі ўвагу на кола. Гэта кола нашага Тыдня беларускай мовы і літаратуры.

**3 вядучы.** У нашых продкаў кола з'яўлялася сімвалам сонца, бясконцасці жыцця, руху наперад.

**4 вядучы**. Хай жа рухаецца наш Тыдзень наперад, а вашы сэрцы напаўняюцца любоўю да роднай зямлі і роднага слова.

**Чытальнік.** Дык чаруй жа людзей паміж моваў другіх
І гучы вечна ярка і нова,
Мова продкаў маіх і нашчадкаў маіх –
Беларуская родная мова.

*Гучыць фінальная песня пра Беларусь.*

# "Я - БЕЛАРУС! Я ГАНАРУСЯ, ШТО МАЮ ГЭТАЕ ІМЯ..."

*Урок-вечарына*

*Я – Беларус!Я ганаруся, што маю гэтае імя: урок-вечарына // Роднае слова. – 2007. - № 2. – С. 78-84.*

**Мэты:**

1. Выхоўваць у вучняў гонар, павагу, любоў да сваёй нацыі.
2. Нагадаць прозвішчы людзей, якія прынеслі славу Беларусі.
3. Развіваць у школьнікаў уменне крытычна мысліць, выказваць свае думкі.

**Форма мерапрыемства:** справаздача творчых груп.

**Абсталяванне:** стол, засланы абрусам; выстава кніг вядомых пісьменнікаў; запісы на дошцы:

*Любіце гэтую сваю святую зямлю адцана і да канца. іншай вам не дадзена, дый непатрэбна.*

*У. Караткевіч.*

*Кожная птушка ў сваё гняздо вяртаецца з выраю.*
*Кожны бадзяга-звер знаходзіць сваю бярлогу.*
*Кожная рыба свайго трымаецца віру.*
*Дык ці ж магу я забыцца матчынага парогу?*

*Г. Бураўкін.*

**ХОД МЕРАПРЫЕМСТВА**

*За два тыдні да вечарыны клас дзеліцца на групы. Кожнай даецца заданне падрыхтаваць матэрыял па названай тэме. Настаўнік дапамагае вучням, раіць, у якой форме лепш правесці справаздачу.*

**1-ы чытальнік.** У сівой даўніне,
Дзе губляецца летапіс часу,
Дзе народы зямлі і паданні пачатак бяруць,
Кінуў вокліч гусляр:
-Як, Радзіма, назваць цябе шчасна?
З трох бярозак адна
Адгукнулася:
- Белая Русь.
І паверыў гусляр,
І распраміў магутныя плечы,
Ціха струны крануў:
- Помні славу сваю, беларус! Мы прынеслі яе
З поля Неўскай і Грунвальдскай сечы,
Каб жыла у вяках!
Наша вольная - Белая Русь.
А калі наш магнат
Выракаўся народа і веры

І Ягайла ў Літве
Ладзіў з Полынчай вясельны хаўрус,
Мы за праўду сваю
Паўставалі з агнём і сякерай,
Каб жыла у вяках!
Наша мужная - Белая Русь...
Так спяваў той гусляр,
І сягоння ў бярозавым гаі
Прыпыніся на міг, цішыню на зары не паруш
І пачуеш тады, як нябачныя гуслі іграюць,
Горды голас звініць:
- Помні славу сваю, беларус!

*Л. Паўлікава. Балада пра нараджэнне Беларусі.*

**1-ы вядучы.** На жаль, час сведчыць, што нехта з беларусаў забыўся пра сваю славу, пра сваю ўласную гісторыю. Успомніць, паглядзець па-новаму на некаторыя яе старонкі і дапаможа наша мерапрыемства.

*Гучыць песня "Люблю наш край" (муз. М. Ра- венскага)*. Або можна прачытаць аднайменны верш.*

**2-і вядучы.** Люблю наш край, старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз пазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла...

Так прызналася ў любові да Радзімы Канстанцыя Буйло. Дзе б мы ні былі, якую б экзатычную прыроду ні бачылі, нас заўсёды цягне да нашых лясоў, да нашых палёў. Чым жа так прываблівае беларуская зямля? Напэўна, не толькі сваёй сціплай і рамантычнай прыродай, мовай, казкамі і легендамі, але і людзьмі, якія жывуць тут. Гэта пра нашу беларускую зямлю напісаў Уладзімір Караткевіч: "Любіце гэтую сваю святую зямлю адцана і да канца. Іншай вам не дадзена, дый непатрэбна".

**1-ы вядучы.** Кожны чалавек павінен ведаць, дзе яго карані, а таксама славутыя імёны краіны, рысы характару беларуса. Ці задумваліся вы калі-небудзь, які ж ён, беларус?

**2-і вядучы.** Слова даецца першай групе.

Прадстаўнік нершай групы. Наша група давала адказ на пытанне: «Ці згодныя вы са словамі Ніла Гілевіча "Я - беларус! Я ганаруся, што маю гэтае імя..."?». Прывядзіце прыклады з гісторыі, назавіце імёны славутых людзей, якія пацвердзілі б вашу думку.

**1-ы вучань.** Спытайцеся ў кожнай сасны і бярозкі, -
Яны раскажуць, як даўняй парой
Хадзіў тут Вашчыла, Хвясько, Каліноўскі,
Вадзілі атрады на подзвіг геройскі,
Іх слава, як сонца, стаіць над зямлёй.

*П. Броўка. Беларусь.*

**2-і вучань.** Не толькі названымі імёнамі можа ганарыцца Беларусь і кожны грамадзянін нашай краіны.

**1-ы вучань.** Кірыла Тураўскі, Еўфрасіння Полацкая, Францішак Скарына, Мікола Гусоўскі, Францішак Багушэвіч, Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў і многія іншыя - гонар і слава нашай нацыі, а таму давайце паклічам Памяць, каб яшчэ раз нагадаць іх імёны.

**Памяць.** Памяць жывая, і памяць прыходзіць Аб тых, хто пакінуў след у гісторыі. Я выклікаю сваёй памяццю вас, паважаны Францішак Скарына!

**Ф. Скарына.** Мэту маю і надзею, пакуту маю і трывогу, -
З літар, як з кропелек поту,
Збіраў я свае першадрукі
Не для цароў венцаносных, абраннікаў бога,
А для цябе, светласэрцы мой люд чарнарукі.

*Г. Бураўкін. Ленін думае пра Беларусь.*

Лічу я кнігі
Скарбамі сваімі.
Хачу, каб непісьменнасці імгла
Святло,
Што выпраменьваецца імі,
Не зацямніла, не перамагла!

*У. Скарынкін. Пачатак.*

**2-і вучань.** Марыў калісьці славуты Скарына,
"Ціснучы" кнігі на мове бацькоў:
Простаму люду у роднай краіне
Зробіць даступнай ён мудрасць вякоў.

*Н. Гілевіч. Мара Скарыны.*

**Памяць.** Мікола Гусоўскі!

**М. Гусоўскі.** Кожная птушка ў сваё гняздо вяртаецца з выраю.
Кожны бадзяга-звер знаходзіць сваю бярлогу.
Кожная рыба свайго трымаецца віру.
Дык ці ж магу я забыцца матчынага парогу?

*Г. Бураўкін. Ленін думае пра Беларусь.*

**3-і вучань.** Спынім забойства! Сумленне, і розум, і гонар
Уладна нагадваюць кніжніку; як са званіцы,
Бі ў сваё звонкае слова, узбройвай народы Супраць разбою!

*М. Гусоўскі. Песня пра зубра.*

**Памяць.** Еўфрасіння Полацкая!

**Е. Полацкая.** Я крывінка твая - крывічанка,
Я былінка твая - палачанка,
Як над пожняй тужлівая чайка,
Я лячу да цябе, Радзіма,
Са святога Ерусаліма.
Я лячу, ды не маю сілы
Узляцець, бо аслаблі крылы,

А не хочацца ж так у магілу –
На святой хай сабе - ды чужыне:
Смерць, як рай, у сваёй дамавіне...
Мне б тады - і жыццё не віною,
Што не сплачана цяжкай цаною,
агні б сплывалі Дзвіною,
Як грахі мае, як правіны,
Прадтабой, маім сонцам адзіным.
Я крывінка твая - Еўфрасіння,
Нада мной неба сіняе-сіняе.
Ападаюць крылы знясілена...
Забяры мяне, Маці, Сястрыца,
Ці прышлі хоць жменьку зямліцы...

*В. Зуёнак. Апошняя малітва Еўфрасінні Полацкай.*

**1-я вучаніца.** Асветніца наша, духоўны ўладар,
паганства і цемру скарыла,
каб Полацк узвысіць.
На шлях яе мар з Полацка выйшаў Скарына.
У сэрцы чарніцы палае агонь.
Падзеі тых дзён па парадку
збірае на славу народа свайго
і летапіс піша нашчадкам.
У келлі маленькай, у ціхім сяльцы,
не марыць пра ўзнагароду.
Не толькі царкве яе веліч душы - жывому народу і роду.
Адчула: народ не ўчора паўстаў.
Не заўтра канец нам прысудзяць.
З мінуўшчыны слаўных падзеяў і спраў
мы ёсць,
мы былі,
мы будзем.

*Л. Геніюш. Еўфрасіння Полацкая.*

**Памяць.** Францішак Багушэвіч!

**Ф. Багушэвіч.** Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую мае; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы.

**4-ы вучань.** Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею,
За тое, што ў сэрцы збудзіў ты надзею,
Што між братоў нашых знаходзяцца людзі
З кахаючым сэрцам і баляшчай грудзяй.
Дзякуй табе, браце, і за тыя словы,
Што ўспомнілі звукі нашай роднай мовы.
Бяры, браце, дудку, наладзь і жалейку,
Няхай песнь смутная ідзе у калейку

І будзіць у сэрцах мысль аб лепшай долі,
Якой мы не знalі дагэтуль ніколі.

*А. Гурыновіч. Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею...*

**Памяць.** Максім Багдановіч!
**М. Багдановіч.** Народ, Беларускі Народ!
Ты - цёмны, сляпы, быццам крот!
Табою ўсягды пагарджалі,
Цябе не пушчалі з ярма
І душу тваю абакралі, -
У ёй нават мовы няма.

*М. Багдановіч. Народ, Беларускі Парод!*

**5-ы вучань.**
Сцюжны час, бязмежна-суровы.
Спіць народ, нібы зерне ў раллі.
Ты прыйшоў
І гарачым словам
Рунь узняў на роднай зямлі*.

*У. Караткевіч. Багдановічу.*

**Памяць.** Уладзімір Караткевіч!
**У. Караткевіч.** Хто забыў сваіх продкаў - сябе губляе,
Хто забыў сваю мову - усё згубіў.
**6-ы вучань.** Быў. Есць. Буду.
Таму, што заўжды, як пракляты,
Жыву бяздоннай трывогай,
Таму, што сэрца маё распята
За ўсе мільярды двухногіх.
За ўсіх, хто ўздымае цяжкія разоры,
Хто ў гарачым пекле металу,
За ўсіх, хто змагаецца з небам і морам,
За жывых і за тых, што сканалі.

*У. Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду.*

**Памяць.** Міхась Чарот!
**7-ы вучань.** Міхась Чарот нарадзіўся ў мястэчку Рудзенск**.
**М. Чарот.** Я вам не здрадзіў,
Не зманіў,
Бо славіў наш савецкі будзень.
Свой верш сардэчнай чысціні
Ахвяраваў я родным людзям.
Я не чакаў І не гадаў,
Бо жыў з адкрытаю душою,
Што стрэне лютая бяда,
Падружыць з допытам,
З турмою.
Прадажных здрайцаў ліхвяры

Мяне заціснулі за краты.
Я прысягаю вам, сябры,
Мае палі,
Мае бары,
Кажу вам - я не вінаваты.
Паверце - я не вінаваты!

*М. Чарот. Прысяга.*

**8-ы вучань.** То ён бачыцца мне Малады,
кучаравы, вясёлы,
У кашулі у вышытай ёгка ідзе па зямлі,
І вітаюць яго,
Пазнаюць беларускія сёлы,
Дзе ён госцем жаданым і любым
У кожнай сям'і.
То на плошчы святочнай
Пад гукі ўрачыстага гімна
Верш забыты чытае,
І слухаюць сцішана людзі:
"Не расіце слязамі
Вы брацкіх магіл...
Так было, але гэтак – Не будзе!.."

*Н. Гілевіч. Сустрэча ў снах.*

**1-ы вядучы.** Справаздача 2-й групы.

**1-ы вучань.** Мы мусілі адказаць на пытанне, якімі рысамі характару валодаюць беларусы. Можна было выкарыстаць такія словы:

- Помні ў горы і скрусе, што ты з Беларусі.
- А што гэта значыць?
- Што ў нас не плачуць.
- А як не стрываюць?
- То слёзы хаваюць.

*Г. Іванова. Размова з сынам.*

**2-і вучань.** На гэтае пытанне мы хочам адказаць словамі У. Караткевіча з нарыса "Зямля пад белымі крыламі" і вершамі Юрася Свіркі***, Рыгора Барадуліна***, Сцяпана Гаўрусёва.

**1-ы вучань.** Ці задумваліся вы пра беларусаў як пра людзей з адметным характарам? Ці задумваліся, які ён, беларус?

**1-ы чытальнік.** Ёсць чаму, ёсць чаму
І ў народа майго павучыцца:
Як змагацца з чужынцам
Суровай парой.
Ёсць за што, ёсць за што
І народу майму ганарыцца:
Не хадзіў і не лез ён
На землі чужыя вайной.

І сябе не лічыў ён ніколі выключным.
"Болей дбай пра сябе!" –
Спачувалі народы яму.
І цаніў ён заўсёды
Братэрскую еднасць і лучнасць,
Добра ведаў народ мой:
Не выжыць ніяк аднаму.

**2-і вучань.** Рысы твару мяккія, аблічча здаецца далікатным, але гэтая далікатнасць падманвае. Беларусы вынослівыя, цягавітыя. Там, дзе другі можа апусціць рукі, беларус будзе цягнуць.

**2-і чытальнік.** Вырываўся ён з цемры,
Прыгнёту, галечы і гора.
Не адстаць ад суседзяў!
Спатыкаўся, наперад ішоў.
І дарма, што ў свой час
(Хоць хацеў) не прабіўся да мора –
Мора лёну ў яго,
І разлівы лугоў,
І бязмежжа лясоў.

**3-і вучань.** Беларусам прыродна ўласцівыя павага да іншых народаў і памяркоўнасць да таго, хто думае іначай.

**3-і чытальнік.** Быў адданы спрадвеку
Славянскаму крэўнаму брацтву,
З ім дзяліўся усім,
Што ў стагоддзях займеў.
Яго роднаю мовай Гаварыла Вялікае княства,
А пасля без яе, незаменнай,
Марнеў і нямеў.
І маўчанню яго, і цярплівасці
Можна здзівіцца.
Кажуць, доля такая:
Пазначана войнамі скрозь.
Ёсць чаму, ёсць чаму
І народу майму павучыцца,
Каб пакутліва крыўду на лёс свой
І вечнасць не нёс.

*Ю. Свірка. Верны крэўнаму брацтву.*

**1-ы вучань.** Гэтаму люду ўласціва інстынктыўнае адчуванне справядлівасці і несправядлівасці. Галоўнай рысай з'яўлялася свабодалюбства.

**4-ы чытальнік.** Наш дом з адкрытымі варотамі
На скрыжаванні ўсіх дарог.
Але з нявыцертымі ботамі
Не запрашаем за парог.

Хто з каменем ішоў за пазухай,
Збіраўся сесці за наш стол
(Мо пабалюе ўволю раз няхай?),
І сёння корміць цвёрды дол.
Рукамі, ад спякоты чорнымі,
Што выціраць не любяць слёз,
Мы перамолвалі, як жорнамі,
Не раз, не два свой горкі лёс.
Але з пакорнымі далонямі
Мы не хадзілі на паклон,
Калі усходамі зялёнымі
Ад хцівых рук наш гінуў плён.

*С. Гаўрусёў. Хлеб-соль.*

** Верш чытаецца цалкам.*

*** Засяроджванне ўвагі на месцы нараджэння той ці іншай дзейнай асобы прывязваецца да рэгіёну, у якім знаходзіцца школа. Напрыклад, пры правядзенні вечарыны на Аршаншчыне перад выступам уяўнага Уладзіміра Караткевіча хтосьці з вучняў паведамляе, што пісьменнік нарадзіўся ў Оршы. - Заўвага рэд.*

**** Вершы чытаюцца некалькімі вучнямі. Пазначэнні знаходзяцца пасля апошняга радка. — Заўвага рэд.*

**2-і вучань.** Беларус вызначаецца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе.

**5-ы чытальнік.** Мы больш сваёй ахвярнасцю вядомы,
Мы - беларусы,
Мы - народ такі.
Ахвотна забываем, што мы,
Хто мы.
Згадаюць
Нашай памяці вякі.

**1-ы вучань.** Галоўнае ў нашым характары - сціпласць.

**1-ы чытальнік.** Мы сціпласцю сваёй здаўна вядомы,
Саміх сябе хваліць нам не з рукі.
Хай слабакі
Аж падаюць ад стомы,
На плечы ўзяўшы
Пыхі мех цяжкі.

**2-і вучань.** Усе, хто прыязджае да нас, адзначаюць як адну з галоўных рысаў гасціннасць.

**2-і чытальнік.** Мы ўсім сваёй гасціннасцю вядомы,
Надзейныя сябры і дружбакі.
І госць, і падарожны ў нас,
Як дома.
А злым і травы колюцца ў бакі.

Гатовы ўсё аддаць –
І тым багаты,
Мы - беларусы,
Мы - народ такі.
Што з краю небяспекі нашы хаты,
Пра гэта
Не забудуць чужакі!

*Р. Барадулін. Мы - беларусы.*

**1-ы вучань.** Уласціва людзям кемлівасць, нават нейкая хітрасць.

**2-і вучань.** Беларус - вялікі аматар пажартаваць з суседа, але больш з самога сябе.

**1-ы вядучы.** Беларусы - сціплы, добры, памяркоўны народ, які мае свае гісторыю, традыцыі.

**2-і вядучы.** Справаздача 3-й групы.

**1-ы вучань.** Наша група павінна была знайсці творы, прысвечаныя тэме "Я - беларус! Я ганаруся, што маю гэтае імя...", і праінсцэнізаваць іх.

**1-ы чытальнік.** Ці варта пытацца: "А хто там
ідзе
Паважнай хадой без прымусу?" Сягоння па песнях, што льюцца
з грудзей,
Пазнаеш: ідуць беларусы.
А што яны нясуць
напаказ,
Сумленныя гэтыя людзі?
Мо крыўду-бяду, што калісьці
не раз
Пякла іх апалыя грудзі? –
О, не! Не галечу
спрадвечнай глушы,
Не крыўду і цяжкае гора, -
Нясуць яны шчасце і веліч
душы,
Раскутасй пад залп "Аўроры".

*С. Бандарэнка. Ідуць беларусы.*

*Гучыць песня "Зямля любімая" (словы Н. Гілевіча, музыка Л. Захлеўнага).*

**1-ы вучань.** Рысы нацыянальнагахарактару беларуса выяўляюцца ў герояў камедыі "'Грыбунал" Андрэя Макаёнка.

*Інсцэнізацыя ўрыўка з другой дзеі камедыі.*

*На сцэне Валодзька і Цярэшка.*

**Валодзька.** ...Ты мне не бацька!

**Цярэшка.** А хто ж я тады?

**Валодзька.** Здраднік! І падумаць толькі - хто?! Мой бацька!.. Як жа мне цяпер таварышам у вочы глядзець? Як жа мне цяпер на вуліцу выйсці?

Другіх жа хоць пад прымусам, сілаю ставілі старастам, а ты... Добраахвотна, сам папрасіўся, пры людзях! Я ледзь не згарэў ад сораму.

**Цярэшка.** А і згарэў. Цэлы астаўся.

**Валодзька** *(аж застагнаў).* І гэта ў той час, калі лепшыя людзі, яго ж сыны, жыцця не шкадуюць, кроў сваю праліваюць, да апошняга дыхання... схапіліся з ворагам. А ты ў гэтую цяжкую хвіліну памагаеш не сынам, а ворагу! Якая ж кара павінна пасці на тваю галаву?

**Цярэшка.** Бацюхны! Камісар! Ну чысты камісар! Такіх я толькі ў кіно бачыў. Чапай! Жывы Чапай! А я і не ведаў, што жыву побач з такім героем! А?

**Валодзька.** А-а, дыкты яшчэ насміхаешся? На, на, стараста, чытай...

Валодзька вымае са свае кішэні лістоўку і суе бацьку пад нос.

- На, чытай!..

Валодзька чытае сам. Па памяці.

"Радзіма наша, акрываўленая Бацькаўшчына наша заве цябе на подзвігі! Бі ворага! Бі немца! Ратуй Бацькаўшчыну! Памагай братам сваім знішчаць прышэльцаў! Радзіма кліча сваіх верных сыноў. Адгукніся стрэлам па ворагу!"

Чуў? Я сёння іх сорак штук перапісаў. Ноч сядзеў. Во. Бачыш? На! "Смерць нямецкім захопнікам!" А цяпер дапішу: "І іхнім халуям!"

**Цярэшка.** Ціш-ш! Вар'ят! Чаго гарланіш? Ачмурэў? Жыць табе надакучыла? Крый бог, хто пачуе...

**Валодзька.** Хай чуюць! Хай ведаюць, які ў старасты сын! Дагэтуль таіўся, а цяпер не буду! Хай усе ведаюць, што я ненавіджу фашыстаў, што яны - мае заклятыя ворагі!

**Цярэшка.** Дурненькі! Ціха! Пачакай! Малады ты...

**Валодзька** *(не слухае бацьку).* Як мне жыць?.. *(На вачах у юнака слёзы. Валодзька стараецца стрымаць сябе, не паказаць сваю слабасць.)* Не! Я змыю гэту пляму з нашай сям'і... Ты зразумеў, бацька? Я заўсёды гатоў!

**Цярэшка.** Як гэта ты змыеш? Пляму.

**Валодзька.** Як? А вось так. Абвяжу сябе гранатамі, вазьму яшчэ процітанкавую міну, у абоі загарну. І пайду к фашысцкаму каменданту і гэтаму начальніку паліцыі... Падыду і... ірвану чаку. Мне канец, але і яны падохнуць. Вось як! Не будзе ён хадзіць да Надзейкі! І плямы на нашай сям'і не будзе!

**Цярэшка** *(перапужаўся).* Сынок! Сынок! Ты што? Здурэў? Пачакай, пакуль мама прыйдзе.

*Валодзька выходзіць з хаты.*

Зіна! Галя! Надзея! Затрымайце яго! Не пускайце яго!

*Інсцэнізаванае інтэрв'ю.*

*Гучыць песня Булата Акуджавы з кінафільма "Беларускі вакзал".*

**2-і чытальнік.** Вы зазналі дым і попел, спусташэнне
лютых войнаў,
Хлеб з бядою-лебядою, лёс

салдаткі-удавы;
Вы трывожна сустракалі век
дваццаты неспакойны,
Не схілялі ў час нашэсцяў
непакорнай галавы.
Вам знаёмы кроў і порах,
партызанскія сцяжыны,
Помсты жар у сэрцах добрых, дзе б
каханню гнёзды віць.
Вы на смерць ішлі без страху, беларускія
жанчыны,
У імя Радзімы светлай, міру,
шчасця і любві!
Вы умелі быць гразою. Чырванець
умелі ружай.
Рассыпаць дабра алмазы.
Карчаваць
карэнне зла.
Гэта ваша бессмяротнасць
увасоблена ў Харужай.
З вашай мужнасцю Мазанік меч
дамоклаў узняла!
Вы - пачатак прыгажосці,
вы - жыцця першапрычына...
Я схіляю перад вамі ў знак
пашаны галаву!
*А. Звонак. Беларускія жанчыны.*

**2-і вучань.** "У вайны не жаночае аблічча..." - гэта кніга пра вайну, кніга народнай памяці. У ёй сабраны і гучаць больш за дзвесце жаночых галасоў. Яны расказваюць, як дзяўчаты, што марылі быць нявестамі, станавіліся салдатамі.

*Стол засланы абрусам, Святлана Алексіевіч (хтосьці з вучаніц у яе ролі) дае інтэрв'ю.*

**Журналіст.** Святлана Аляксандраўна, чым адрозніваецца вайна ва ўспрыманні жанчын? Што такое вайна, калі забіваць даводзіцца і жанчыне, прызначэнне якой - дарыць жыццё, а не забіваць?

**С. Алексіевіч.** Каб знайсці адказ на гэтае пытанне, я некалькі гадоў ішла абгарэлымі кіламетрамі чужога болю і памяці і сёння магу сказаць, што для жанчыны вайна - сучаснае людажэрства. Жанчына і вайна - вялікія антаганісты. І калі жанчына адвяргае вайну, то можна паверыць - вайны не будзе ў чалавечым свеце.

**Журналіст.** Якая галоўная ідэя Вашага твора?

**С. Алексіевіч.** Я ўпэўнена, што маральны вопыт пакалення людзей, якое перажыло ўвесь жах вайны, вельмі патрэбны маладым, каб зразумець,

на што здольны чалавек у імя высокіх ідэалаў. Працуючы над матэрыялам для кнігі, я пайшла да жанчын-франтавічак з пытаннямі: што адчувалі яны на вайне, як перажывалі страх, боль, страты?

**4-ы чытальнік.** Слоў няма, каб цяпер гаварыць, -
Яны анямелі.
Слёз няма, каб наўзрыд праліць, -
Яны скамянелі.
На руінах стаю адна
У суровым маўчанні.
А навокал - вайна, вайна...
Папялішчы ды камні.
Я спытала паўшых байцоў:
- Што рабіць мне, скажыце, героі!?
І, здаецца, шапнулі слаўцо:
"Да зброі! Да зброі!"
Н. Тарас. Няма слоў. каб цяпер гаварыць.

**Журналіст.** Вы думалі над пытаннем, што ж прымусіла нашых жанчын пайсці на вайну?

**С. Алексіевіч.** Ва ўсе часы жанчыны ўставалі на абарону Радзімы побач з мужамі, братамі, сынамі. Гэта нацыянальная рыса нашай жанчыны, у душы якой жыве гераічная Яраслаўна*.

**Журналіст.** Дзякуй, Святлана Аляксандраўна, за інтэрв'ю.

**1-ы вучань.** Мы раім прачытаць кнігу, каб не быць заспакоенымі і абыякавымі, апаліць сэрца памяццю пра мінулую вайну і зрабіць усё, каб яна ніколі не паўтарылася.

**2-і вучань.** Калі вы захочаце даведацца больш пра падрыхтоўку да паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, то прачытайце раман "Каласы пад сярпом тваім" У. Караткевіча.

*На сцэне сядзіць стары з лірай. Алесь Загорскі і Кастусь Каліноўскі стаяць і насцярожана сочаць адзін за адным.*

**Алесь** *(пытае не вельмі ветліва).* Ты хто такі?

**Кастусь.** А табе што?

**Алесь.** Ну хто? Паляк? Мазур?

**Кастусь** *(адказвае спакойна).* Беларус.

*Вочы ў Алеся сталі круглыя ад здзіўлення.*

**Алесь.** Што-о? *(паўза).* Адкуль гэта ты даведаўся? Гэта ж я адкрыў. Гэта я - беларус.

**Кастусь.** Адзін Гаўрыла ў Полацку *(усміхаецца).* Тут усе беларусы. А ён адкрыццё зрабіў... Першы... Знайшоўся мне яшчэ - Капернік.

**Алесь.** Але ж я ведаю толькі траіх, якія адказалі мне так. У астатніх няма імя.

**1-ы вядучы.** Непасрэдную сувязь такіх рысаў нацыянальнага характару беларусаў, як шчырасць, гасціннасць, дабрыня, годнасць,

таленавітасць, з бацькаўшчынай, якая нас узгадавала, падкрэсліваюць паэты ў вершах.

**2-і вядучы.** Колькі ўзнёслых і прачулых радкоў, напоўненых патрыятычнымі пачуццямі і думамі пра свой край, мову склалі яны!

**1-ы вядучы.** Кожнае слова - запавет моладзі.

*Гучыць песня "Радзіма мая дарагая" (верш А. Бачылы, музыка У. Алоўнікава)**.*

**1-ы чытальнік.** Ёсць на свеце такія краіны,
Дзе расце нават хлеб на галлі.
А мне нашы бярозы, каліны,
Нашы краскі ў душу заплылі.
Я прыгожых краёў бачыў многа,
Многа пройдзена дальніх дарог.
А найлепшая тая дарога,
Што вядзе на бацькоўскі парог.
Кажуць, дома вуглы памагаюць,
Дома жыць і рабіць весялей...
Чалавек без бацькоўскага краю,
Як без песні ў гаі салавей.

*А. Бялевіч. Бацькоўскі край.*

**2-і чыгальнік.** І гэты край,
Дзе нарадзіўся, рос,
Дзе днее, вечарэе і світае,
Усё -
Ад зор далёкіх і да рос –
Твая Радзіма, Родная, святая.

*Р. Барадулін.*

**3-і чытальнік.** Я - сірата
Без маёй Беларусі.
Ад роднай мовы,
Ад роднай нацыі
Не адцураюся,
Не адракуся!

*П. Панчанка.*

**4-ы чытальнік.** Не знішчым мы, не страцім,
не загубім,
Сваіх азёр, лугоў, сваіх лясоў
І родны край і мову не разлюбім.

*В.Гардзей. Мая граматыка.*

**5-ы чытальнік.** Не сорамна любіць да слёз,
Лічыць твой боль і ўзлёт сваімі
І дзякаваць вялікі лёс,
Што даў спазнаць цябе, Радзіма.
Аглухну - не ад зім і лет,

Аслепну - не ад скрух і плачу, -
Ад прагі чуць твой кожны шэпт
І ўсю тваю бясконцасць бачыць, Мая Радзіма!..

*А. Лойка. Радзіме.*

**6-ы чытальнік.** Адзінай мэты не зракуся,
і сэрцамне не задрыжыць:
як жыць-- дык жыць для Беларусі.
А без яе - зусім не жыць.

*Л. Геніюш. Адзінай мэты не зракуся.*

**7-ы чытальнік.** Ты, Радзіма, мяне прабач!
Я як-небудзь сябе супакою,
Дзень спаткання - мой радасці плач
Ад таго, што я разам з табою.
Ты святая, на свеце адна,
Што журчыш жыватворнай крыніцай.
Дай мне выплакаць душу да дна,
Дай мне ў ногі табе пакланіцца.

*У. Клішэвіч. Ты, Радзіма, мяне прабач!..*

**8-ы чытальнік.** Мой любы край, не дакарай,
Што славіць зноў бяруся.
Калі і ёсць у свеце рай,
Дык ён - на Беларусі!

*С. Законнікаў. Бацькаўшчына.*

*Гучыць песня "Жураўлі на Палессе ляцяць" (верш А. Ставера, музыка І. Лучанка).*

**7-ы чытальнік.** Любіце травы, дрэвы, рэкі,
Прастор палёў, блакіт нябёс,
Цаніце Працу,
Чалавека, -
І Бог вам дасць спагадны лёс.
А каб цанілі вас у свеце, -
"Я лепшых слоў не падбяру", -
Шануйце дзіва на планеце –
Святую нашу Беларусь.
І мову Коласа, Купалы
Вы беражыце з роду ў род,
Каб наша воля не прапала,
Каб не загінуў наш народ.

*А. Ставер. Размоваз нашчадкамі.*

**8-ы чытальнік.** Мы здалёку ўбачылі свабоду
І яшчэ не вырваліся з пут...
Божа,
Не дабаў майму народу
Пошасці,

Няпраўды
І пакут.
У чужым нялюдскім землятрусе
Хіба нечым мелі мы віну?..
Божа,
Адвядзі ад Беларусі
Здраду,
Вераломства
І вайну.
**4-ы чытальнік.** Смутнаю парою нелюдзімай,
Калі ўсё наўкол ідзе на злом,
Божа,
Захіні маю Радзіму
Мудрасцю,
Спакоем
І цяплом!

*Г. Бураўкін. Малітва.*

# ДЗЕЦІ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

*Метадычныя парады па арганізацыі і правядзенню гістарычнай віктарыны*

*Дзеці зямлі беларускай : метадычныя парады па арганізацыі і правядзенню гістарычнай віктарыны // С чего начинается Родина? / ред.-сост. Л. И. Жук. – Минск : Красико-Принт, 2008. – С. 63-78.*

Гістарычная віктарына «Дзеці зямлі беларускай» прапануецца не толькі тым, хто любіць рабіць падарожжы ў мінулае нашай Радзімы, але і тым, хто хоча ўзбагаціць сябе ведамі аб малавядомых ці незаслужана забытых фактах беларускай гісторыі, укладзе беларусаў у нацыянальныя культуры суседніх народаў.

Сто пытанняў віктарыны распрацаваны галоўным чынам на аснове курса гісторыі Беларусі, які вывучаецца ў сярэдніх школах і вышэйшых навучальных установах, што ў значнай ступені вызначае іх характар, але пэўная іх колькасць невядома шырокаму колу чытачоў, і менавіта гэта, на наш погляд, павінна зацікавіць удзельнікаў віктарыны. Будзе вельмі дарэчы ўключыць пытанні, звязаныя з мясцовай тэматыкай.

Каб узмацніць эстэтычнае ўспрыняцце віктарыны, мы прапануем яе арганізатарам выкарыстаць слайды, звязаныя са зместам пытанняў, рэпрадукцыі карцін і малюнкаў беларускіх мастакоў, песні і вершы беларускіх кампазітараў і паэтаў урыўкі з кінафільмаў, фальклорныя творы, выступленні аматарскіх мастацкіх калектываў. Гэта дапаможа больш поўна і змястоўна раскрыць пастаўленае пытанне, падкажа ўдзельнікам правільны адказ.

Мастацкі вобраз віктарыны вызначаны словамі «Услаўляю цябе, край любімы».

Галоўным мізансцэнічным пунктам з'яўляецца вялізны планшэт-экран контурнай карты. У асобныя моманты на карце паказваюцца пластычныя карціны ценявога театра, праецыруюцца слайды-ілюстрацыі, урыўкі з дакументальных і мастацкіх кінастужак па пытаннях віктарыны. Дадатковымі апорнымі пунктамі дэкаратыўнага афармлення глядзельнай залы могуць стаць фотаздымкі ці гравюры старажытных і сучасных архітэктурных ансамбляў Беларусі, рэпрадукцыі карцін беларускіх мастакоў.

Галоўным мізансцэнічным пунктам з’яўляецца вялізны планшэт-экран контурнай карты. У асобныя моманты на карце паказваюцца пластычныя карціны ценявога театра, праецыруюцца слайды-ілюстрацыі, урыўкі з дакументальных і мастацкіх кінастужак па пытаннях віктарыны. Дадатковымі апорнымі пунктамі дэкаратыўнага афармлення глядзельнай залы могуць стаць фотаздымкі ці гравюры старажытных і сучасных архітэктурных ансамбляў Беларусі, рэпрадукцыі карцін беларускіх мастакоў.

*Гучаць пазыўныя беларускага радыё, якія пераходзяць у мелодыю цымбал. Экран-карта асвятляецца промнямі living колеру.*

*На сцэну выходзіць вядучы, які запрашае ўсіх у цудоўны старажытны край, дзе жывуць сціплыя таленавітыя людзі.*

І мы з вамі таксама пачынаем падарожжа па гістарычных шляхах Беларусі.

**Вядучы:** Беларусь! Яна знаходзіцца на скрыжаванні важнейшых еўрапейскіх дарог. Тут праходзіць лінія водападзелу паміж Балтыйскім і Чарнаморскім басейнамі. Тут зліліся славянскія і балцкія плямёны, сутыкнуліся хрысціянскі поўдзень з язычніцкай поўначчу, каталіцтва з праваслаўем.

Зямля Беларусі... Па тваіх шляхах праходзілі не толькі сябры, рэдкі год абыходзіўся без спусташальных варожых нашэсцяў. Крывёю напісана гісторыя беларускага народа, які на працягу многіх стагоддзяў адстойваў сваё права на жыццё.

1. Многія людзі ў розныя гады апісвалі Беларусь. Каля 1130 г. у паўднёвай Беларусі ў сям'і багатых гараджан нарадзіўся вядомы дзе-яч старажытнарускай літаратуры. Яго «Словы», павучанні, казанні служылі ўзорам царкоўна-славянскага красамоўства аж да XIX ст. Назавіце імя гэтага чалавека - першага летапісца беларускай зямлі.

*(Кірыла Тураўскі)*

2. Якія плямёны жылі на тэрыторыі Беларусі ў старажытныя часы? *(Крывічы,радзшічы, дрыгавічы, валыняне (дулебы), яцвягі,мазаўшане, літоўскія плямёны)*

3. У IX-X стст. на тэрыторыі Беларусі з’яўляюцца першыя гарады, якія становяцца буйнымі цэнтрамі рамёстваў і гандлю. Назавіце іх. *(Полацк - 862 г., Тураў - 980 г., Віцебск - 974 г., Заслаўе - каля 985 г.)*

4. Адным з помнікаў архітэктурнага мастацтва старажытнай Русі з'яўляецца Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку, сцены і слупы якой былі распісаны ўнікальнымі фрэскамі. Яе пабудаваў у сярэдзіне XII ст. таленавіты майстар, мастацтва якога аказала вялікі ўплыў на творчасць многіх старажытнарускіх дойлідаў. Назавіце яго імя. *(Палачанін Іаан)*

5. Выдатным творам старажытнарускага мастацтва з’яўляецца крыж, зроблены ў 1161 годзе для Ефрасінні Полацкай. Як звалі майстра-ювеліра, які зрабіў гэты крыж? *(Лазар Богша)*

6. 1240 год. Аляксандр Неўскі вядзе дружыну на бой са шведамі. У гэтай бітве разам з наўгародцамі і пскавічамі ўдзельнічала і дружына палачан. Назавіце імя полацкага воіна, які, як сведчыць летапіс, вызначыўся мужнасцю і адвагай і заслужыў асабістую падзяку Аляксандра Неўскага. *(Якаў Палачанін)*

7. У XIII ст. валынскі князь Уладзімір Васільевіч загадаў зам-кнуць яцвягам выхад з пушчы, пабудаваць ля ракі Лясной вежу ў 17 сажняў вышыні. Гэтая вежа, якая стаіць у Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці, стала

своеасаблівым помнікам ваеннага дойлідства Беларусі. Каму было даручана яе будаўніцтва? *(Дойліду Алексе)*

8. У XIII ст. у мэтах барацьбы супраць татара-манголаў і крыжакоў заходнерускія і літоўскія плямёны аб'ядналіся ў адзіную дзяржаву - Вялікае княства Літоўскае. Агульнадзяржаўнай мовай гэтай федэрацыі розных зямель была беларуская мова, таму што славяне стаялі на больш высокай ступені развіцця і ўжо мелі пісьменнасць. Назавіце шрад, які стаў рэзідэнцыяй і месцам каранавання Міндоўга - першага Вялікага князя Літоўскага? *(Навагрудак)*

9. Пачатак XIV ст. Па заходняй Беларусі цякуць рэкі крыві ад спусташальных нашэсцяў крыжакоў-тэўтонаў. Палкаводцам літоўска-беларускага войска становіцца таленавіты военачальнік - праўнук Аляксандра Неўскага і зяць Вялікага князя Літоўскага Гедыміна. Гэты палкаводзец у 1314 г. разбіў крыжакоў пад Навагрудкам, у 1322-1323 гг. дапамог Пскову ў барацьбе з Лівонскім ордэнам. У розныя гады герой беларускай зямлі ўзначальваў паходы войска Вялікага княства Літоўскага на Прусію, Мазовію, Брандэнбург. Назавіце яго імя. *(Давыд Гарадзенскі)*

10. 8 верасня 1380 года на рацэ Няпрадве сустрэліся полчышчы татара-манголаў якіх узначальваў хан Мамай, і войска Маскоўскай Русі, у склад якога ўваходзілі дружыны полацкага князя Андрэя. Дзмітрый Данскі павёў палкі русічаў у бой. Закіпела жорсткая сеча. У рашучы момант Кулікоўскай бітвы, калі рускае войска пачало адступаць, запасны полк рускіх ударыў па манголах і прынёс перамогу. Узначальваў гэты полк ураджэнец Магілёўшчыны, які знаходзіўся на службе ў Дзмітрыя Данскога. Як звалі гэтага героя? *(Ваявода Баброк)*

11. Пачатак XV стагоддзя. Крыжаносцы Тэўтонскага ордэна імкнуцца на ўсход. Польскі кароль Ягайла збірае войска, каб су-стрэцца ў рашучай бітве з ворагам. Пад Грунвальдам (1410 год) галоўны ўдар тэўтонаў прыняла на сябе частка агульнаславянскіх войскаў - смаленскія палкі, у склад якіх уваходзілі атрады з Полацка, Віцебска, Крычава, Мсціслава, Магілёва іінншых гарадоў. Хто кіраваў гэтымі палкамі? *(Мсціслаўскі князь Юрый)*

12. Назавіце ўсходнеславянскага першадрукара. Калі і дзе ён выдаў сваю першую кнігу і як яна называлася? *(Францыск Скарына. Нарадзіўся ў 1490 г., у Полацку. У 1517 г. у Празе ён выдаў «Псалтыр» на царкоўна-славянскай мове)*

13. У 1521-1522 гг. у Рыме з'яўляецца першы беларускі твор, напісаны лацінскімі літарамі. У «Песні пра зубра» свае ідэалы аб шчасці народа выказаў першы беларускі паэт-лацініст эпохі Адраджэння. Хто гэты паэт? *(Мікола Гусоўскі. Нарадзіўся, верагодна, на Магілёўшчыне ў сям 'і лесніка-паляўнічага)*

14. Які аўтар XVI ст. выдаў першую беларускую кнігу, надрукаваную ў межах сучаснай Беларусі? *(У 1562 г. Сымон Будны (1530-1593 гг.) надрукаваў у Нясвіжы «Катэхізіс». Больш раннія выданні Ф.*

*Скарыны ўбачылі свет у Празе, Вільні, а беларускія выданні 50-х гадоў XVI ст. выходзілі на польскай мове)*

15. У XVI ст. на тэрыторыі Беларусі пачынае дзейнічаць адзіны ў Еўропе сістэматызаваны збор законаў па ўсіх галінах тагачаснага права. Гэты помнік старажытнабеларускай мовы і юрыдычнай думкі феадальнай эпохі аказаў вялікі ўплыў цры кадыфікацыі прускага права, стаў дапаможнай крыніцай заканадаўства Полыпчы, яго артыкулы перайшлі ў Саборнае ўлажэнне 1649 г. у Расіі, ён ужываўся ў судах Украіны, Эстоніі і Латвіі. Як называўся гэты збор законаў? *(Статут Вялікага княства Літоўскага, розныя рэдакцыі якога выходзілі ў 1529, 1566 і 1588 гг. Гэты Статут дзейнічаў на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерній да 1831 г., у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерній - да 1840 г.)*

16. Кім, дзе і калі быў надрукаваны першы ў свеце «Буквар»? *(Стрыдонам Собалем, жыхаром Куцейна, што пад Оршай, у 1631 годзе выдадзены на 40 лістах «Букварь сиречь начало учения детям начинающим чтению извыкати»)*

17. Назавіце дзеяча беларускай культуры XVI ст., першага вучонага ўрача-беларуса, якому ў адным з італьянскіх універсітэтаў быў выдадзены дыплом доктара лекарскіх навук. *(Францыск Скарына, 9 лістапада 1512 года, Падуанскі універсітэт)*

18. У другой палове XVII ст. беларускія майстры прынеслі ў Расію мастацтва вырабу шматкаляровай рэльефнай кафлі, якое з XIV ст. было вядома ў Полацку. У Маскве яны ўпрыгожвалі Круціцкі церам і церамы Крамлёўскага палаца, сабор Новаіерусалімскага манастыра на Істры. Назавіце імёны гэтых майстроу. *(Ігнат Максімаў з Копысі і Сцяпан Іваноў з Мсціслава)*

19. Беларускія разьбяры ўпрыгожылі аб е' бой «восьмае цуда свету» - падмаскоўную рэзідэнцю цара Аляксея Міхайлавіча - Каломенскі палац і сабор Новадзевічага манастыра ў Маскве. Як звалі майстра, які кіраваў гэтымі работамі? *(Шклоўскі майстар Клім Міхайлаў)*

20. У якім рускім тэатры, створаным у XVII ст., з 78 акцёраў 60 былі беларусамі? *(У першым рускім тэатры, які ў 1672 годзе даваў прадстаўленні пры двары цара Аляксея Міхайлавіча. Акцёрамі гэтага тэатра ў пераважнай большасці былі беларусы-перасяленцы - жыхары Мяшчанскай слабады ў г. Маскве.)*

21. Хто з беларусаў быў адным з першадрукароў? *(Пётр Мсціславец)*

22. Назавіце заснавальніка, драматурга і рэжысёра першага рускага прыдворнага тэатра? *(Сімяон Полацкі (Самуіл Емяльянавіч Пятроўскі-Сітніяновіч, 1629—1680 гг.), беларускі і рускі грамадскі і царкоўны дзеяч, педагог. Нарадзіўся ў Полацку ў купецкай сям'і)*

23. Хто з явіўся ініцыятарам стварэння ў Маскве першай вышэйшай навучальнай установы? *(Сімяон Полацкі. Славяна-грэкалацінская акадэмія)*

24. Дзеяч беларускай культуры XVII ст. надрукаваў граматыку славянскай мовы, якая амаль два стагоддзі была школьным падручнікам у

Расіі, Беларусі, Балгарыі і Сербіі. Вялікі рускі вучоны М. Ламаносаў назваў гэтую кнігу «вратами учености». Хто напісаў першую ўсходнеславянскую граматыку? *(Мялецій Сматрыцкі)*

25. У 1660 годзе ў Маскву прыязджае са сваімі вучнямі ўраджэнец г. Полацка, які стаў пачынальнікам рускай паэзіі, залажыў асновы рускага вершаскладання, выпеставаў школу рускіх паэтаў (К. істомін, П. Буслаеў, С. Мядзведзеў). Як яго звалі? *(Сімяон Полацкі)*

26. Берасцейскі філосаф-атэіст XVII ст.. які напісаў твор «О Несуществовании бога», па патрабаванню іезуітаў быў аддадзены пад суд епіскапаў і прыгавораны да смерці. Яму адсеклі галаву, цела спалілі на кастры, а попел заклалі ў пушку і развеялі. Назавіце імя беларускага Джардана Бруна. *(Казімір Лышчынскі, 1634 – 1689 гг.)*

27. У 1649 годзе ў жорсткай сечы з войскам Лоевам трапіў у палон асабісты сябар Багдана Хмяльніцкага, палкоўнік кіеўскі і пераяслаўскі, беларус, якога звалі Міхаілам. У адказ на прапанову Радзівіла перайсці да яго на службу цяжка паранены Міхаіл Крычэўскі плюнуў яму ў вочы і растршчыў сабе галаву аб кола воза. Адкуль родам быў гэты герой? *(З-пад Брэста, шляхціц)*

28. Назавіце заснавальніка ўкраінскай графікі (XVII ст.)? *(Тарасевіч з-пад Глуска, які на Украіне пастрыгся ў манахі)*

29. У XVIII ст. на Беларусі шырокі размах набывае антыфеадальны сялянскі рух. Два гады ў Крычаўскім старостве (1743-1744 гг.) працягвалася паўстанне супраць прыгнятальнікаў, якое ўзначальваў гандляр воскам. Як звалі народнага барацьбіта? *(Васіль Вашчыла)*

30. У XVII ст. па загаду князя. Радзівіла ў адным з гарадоў Беларусі была створана школа, у якой дрэсіравалі мядзведзяў, - адзіная ў Еўропе таго часу. У якім горадзе была створана «мядзвежая акадэмія»? *(У Смаргоні)*

31. Помнікамі творчасці руплівых чалавечых рук з'яўляюцца замкі і палацы Беларусі. Многае бачылі яны на сваім вяку. У 1385 г. у Крэўскім замку было абвешчана аб дзяржаўным аб'яднанні Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. У 1596 г. брэсцкія муры з'явіліся нямымі сведкамі царкоўнай уніі, якая паклала пачатак акаталічванню беларускага народа. Адзін з замкаў Беларусі ў розныя часы быў рэзідэнцыяй Вялікага князя Літоўскага - Вітаўта, польскага караля Стэфана Баторыя, а ў 1793 г.— месцам правядзення сойма, на якім быў зацверджаны другі падзел Рэчы Паспалітай. Пра які замак ідзе гаворка? *(Гродзенскі замак)*

32. 1787 г. Прафесар рыторыкі і паэзіі Забельскай гімназіі (цяперашні Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобл.) напісаў для школьнага тэатра п'есу «Камедыя» з 3-х актаў і 38 сцэн. У перыяд афіцыйнай забароны беларускай мовы гэты аўтар занатаваў жывую беларускую мову таго часу. Назавіце яго імя. *(Каятан Марашэўскі)*

33. У 1788 г. граф С. Г. Зорыч заснаваў на Магілёўшчыне тэатр, у якім выступалі беларускія прыгонныя артысты. У 1800 г. дзейнасць гэтага тэатра была спынена, аркестр перададзены ў Маскву, а 14 прыгонных

артыстаў - дырэкцыі Пецярбургскіх Імператарскіх тэатраў. Пра які тэатр ідзе гаворка? *(Шклоўскі тэатр)*

34. Беларускія кірмашы заўсёды вылучаліся арыгінальнымі забавамі. У канцы XVIII ст. жыхары аднаго з беларускіх гарадоў даволі часта былі сведкамі незвычайных відовішчаў, якія праходзілі ў час вялікага з'езду дваран на чэрвеньскі кірмаш: вечарам на возеры ладзілі водны карнавал, па вадзе плавалі караблі, падсвечаныя featured рознакаляровымі ліхтарыкамі, палалі феерверкі, паказвалі нападзенне піратаў на мірныя судны, розныя камічныя сцэнкі. Пазней, у канцы XIX ст., менавіта такія відовішчы сталі асновай першага рускага воднага цырка (напрыклад, водная пантаміма «Вясковае свята», якая адбылася ў 1892 годзе ў Вільні ў цырку Годфруа). Назавіце беларускі горад, дзе ўпершыню пачалі праводзіць водныя маскарады. *(Шклоў, маёнтак памешчыка С. Г. Зорыча)*

35. У канцы XVIII ст. (1794 г.) шляхціц беларускага паходжання, родам з-пад Косава, былы генерал амерыканскай арміі, які змагаўся за незалежнасць ЗША, вярнуўшыся на радзіму, узняў паўстанне супраць царызму. Назавіце імя нацыянальнага героя Польшчы. *(Тадэвуш Касцюшка)*

36. Адзін з паплечнікаў Т. Касцюшкі, дыпламат і дзяржазны дзеяч, які ў час паўстання камандаваў паўстанцкімі войскамі, быў вядомым кампазітарам. Яго твор «Падзел Польшчы»- з'явіўся цэлай падзеяй у гісторыі польскай музыкі, а вядомая «Мазурка Дамброўскага» гімнам Польшчы. У маёнтку Залессе, што ля Смаргоні, гэты кампазітар напісаў свой найбольш вядомы паланез «Развітанне з Радзімай». Назавіце яго імя. *(Міхал Клеафас Агінскі (1765 – 1833), старадаўні род якога паходзіць ад беларускага шляхціцаДзмітрыя Глушонка)*

37. У XVIII ст. на Беларусі шырокае распаўсюджанне атрымлівае прыгонны тэатр, драматычныя, оперныя і балетныя спектаклі якога ставіліся ў фальварках магнатаў, у гарадах. У канцы XVII ст. артысты двух прыватных тэатраў былі падараваны каралю Станіславу-Аўгусту і склалі аснову польскага балета ў Варшаве. З якіх гарадоў былі гэтыя артысты? *(Слонім - тэатр Міхала Казіміра Агінскага, Гродна - тэатр Антонія Тызенгаўза)*

38. 24 снежня 1798 г. на хутары Завоссе. Што ля Баранавіч, нарадзіўся будучы вялікі паэт, адзін з арганізатараў тайных таварystваў патрыятычнай моладзі - філаматаў і філарэтаў. Гэты палітычны дзеяч у 1849 г. рэдагаваў у Парыжы інтэрнацыянальную газету «Трыбуна народаў». Ён выступіў пачынальнікам рэвалюцыйнага рамантызму ў польскай літаратуры. Як яго звалі? *(Адам Міцкевіч)*

39. 1812 год. Нашэсце Напалеона. Генерал Платаў атрымаў загад Баграціёна затрымаць французаў. Жыхар гродзенскай вёсачкі Сімакова Дзяніс павёў атрады казакоў па лясных сцяжынках… і закіпела бітва. Наступленне ворага было стрымлена. Баграціён пісаў: «Гэта быў першы поспех нашай зброі ў вайне з французам!» Дзе адбылася гэта падзея? *(Пад Мірам)*

40. Барадзіно. У гэтай бітве супраць французскіх захопнікаў разам з іншымі народамі Расіі вялікую адвагу паказалі воіны-беларусы. 24-я пяхотная дывізія, з ураджэнцаў адной з беларускіх губерняў, пераічна абараняла батарэю М. Раеўскага. З яко губерніі былі тыя воіны? *(З Мінскай)*

41. У час Айчыннай вайны 1812 г. жыхары адной з вёсак Полацкага павета Віцебскай губерні ў адказ на грабяжы і здзекі французскіх акупантаў выступілі са зброяй супраць ворага. Партызанскі атрад гэтай вёскі сумесна з рускімі войскамі двойчы ўдзельнічаў у баях за вызваленне Полацка ад напалеонаўскіх захопнікаў, 22 узнагароды атрымалі сяляне за мужнасць у барацьбе за Айчыну. Пра жыхароў якой вёскі ідзе гаворка? *(в. Жарцы)*

42. Імя аднаго з выхаванцаў Мінскай гімназіі, ураджэнца Мінскай губерні, стаіць ля вытокаў польскай і беларускай оперы. Беларускі пісьменнік В. Дунін-Марцінкевіч прысвяціў яму вершы:

А трэці дудар між намі ўзрос, ён нам братка,
Яму мінская зямелька родненькая матка!...
Трэці дудар як загудзе песенькі радненькі,
Бяду дый гора забудзеш, станеш весяленькі.

Як звалі выдатнага польскага кампазітара? *(Станіслаў Манюшка)*

43. 9 лютага 1852 года ў Мінску адбылася прэм'ера першай беларускай камічнай оперы «Ідылія». Назавіце аўтараў гэтага твора. *(Аўтар лібрэта Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, кампазітар Станіслаў Манюшка, мастак Адам Шэмеш)*

44. Хто з'явіўся адным з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, першым беларускім прафесійным пісьменнікам? *(В. Дунін-Марцінкевіч, 1807-1884 гг.)*

45. ..Бывай здаровы, мужыцкі народзе,
Жыві ў шчасці, жыві ў свабодзе!
І часам спамяні пра Яську свайго,
Што згінуў за праўду для дабра твайго...

Гэты перадсмяротны верш кіраўніка сялянскага паўстання супраць рускага царызму ў 1863 годзе абляцеў усю краіну. Назавіце яго імя. *(Кастусь Каліноўскі)*

46. Назавіце імя актыўнага ўдзельніка гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі, паплечніка К. Каліноўскага, а ў далейшым - генерала Парыжскай камуны, члена І Інтэрнацыянала, сябра К. Маркса і Ф. Энгельса. *(Валерый Урублеўскі, 1836-1908 гг.)*

47. Беларускі рэвалюцыянер пасля паўстання 1863 г. быў вымушаны эмігрыраваць за мяжу. Ён - бацька чылійскай навукі, рэарганізатар прамысловасці, рэфарматар сістэмы адукацыі. Пасля смерці ўраджэнец маёнтка Нядзведка, што каля Міра, быў абвешчаны нацыянальным героем Чылі. Як яго звалі? *(ІгнатДамейка, 1801-1889 гг. У гонар вялікага вучонага ў Чылі яго іменем назвалі хрыбет, горад, мінерал – дамейкіт, ракушку - наўцілус дамейкус, фіялку – дамейкіяна)*

48. Ураджэнец Мінскага павета, выхаванец Мінскай гімназіі пасля паўстання 1863 г. быў сасланы ў Сібір. Гэты энцыклапедычна адукаваны чалавек стаў першым даследчыкам флоры і фауны байкала, аўтарам слоўнікаў камчадальскай і бурацкай моў, сусветна вядомым вучоным-падарожнікам. Назавіце яго імя. *(Бенедыкт Дыбоўскі)*

49. Як звалі дзеда французскага паэта Гіёма Апалінэра? *(Міхаіл-Апалінарый Кастравіцкі, які эмігрыраваў з Навагрудчыны пасля паўстання 1863 г.)*

50. Шматпакутна жылося нашаму народу ў XIX стагоддзі.

А ў краіне так цяжка
(Асіны ад ганьбы палаюць),
І над ёй фанабэрыцца
ГІ'яны, разбэшчаны гун,
Як пры князе Усяславе -
Дзень вялікі, а луста малая,
Як пры князю Ягайле -
На кожную спіну бізун.

Абжыраюц удоў.
П'юць з гарэлкай сірочыя слёзы
Тлустым задам рсселіся
На паднявольнай зямлі,
На шлагбаумы мёртвыя
Пассякалі жывыя бярозы,
На шпіцрутэны гнуткія
Запаведныя вербы звялі.

Гэтыя радкі зверша Уладзіміра Караткевіча прысвечаны сялянскаму паэту-самародку, які мог стаць гордасцю нашага народа – беларускім Шаўчэнкам альбо Бёрнсам. Але салдатчына, куды яго здылі пасля паўстання 1863 года, перашкодзіла гэтаму. «Заграй, заграй, хлопча малы» - так называўся адзіны верш (які дайшоў да нашых дзён) першага беларускага сялянскага паэта. Пра каго ідзе тут гаворка? *(Паўлюк Багрым. Нарадзіўся ў Крошыне, што ля Баранавіч)*

51. Ураджэнец Магілёўшчыны пасля паўстання 1863 г. быў вымушаны пакінуць Радзіму. Перад амерыканскай анексіяй ён быў прэзідэнтам сената Гавайскіх астравоў і змагаўся з амерыканскімі прамыслоўцамі за жыццё і шчасце канакаў. Як яго звалі? *(Мікалай Судзілоўскі)*

52. У сярэдзіне мінулага стагоддзя ў мястэчку Мір польскі і беларускі паэт пачаў і запісаў вершамі гісторыю паштальёна, якая была перакладзена на рускую мову і стала тэкстам рускай народнай песні «Когда я на почте служнл ямщиком». Назавіце яе аўтара. *(Людвіг Кандратовіч, псеўданім - Уладзіслаў Сыракомля, 1823 – 1862 гг. Нарадзіўся ў в. Смольгаў Бабруйскага павета Мінскай губерніі ў сям'і беззямельнага шляхціца. Першы твор Л. Кандратовіча «Паштальён» з 'явіўся ў польскім друку ў 1884 г.)*

53. Назавіце першаадкрывальніка Паўночнай зямлі і першапраходцу Паўночнага Марскога шляху з Уладзівастока ў Архангельск. *(Барыс Андрэевіч Вількіцкі, рускі гідрограф-геадэзіст беларускага паходжання)*

54. 1 сакавіка 1881 года нарадавольцамі было арганізавана пакушэнне на цара. Як звалі рэвалюцыянера родам з Міншчыны, члена беларускай фракцыі партыі «Народная воля», які забіў Аляксандра II? *(Ігнат Яўхімавіч Грынявіцкі, 1856-1881 гг. Нарадзіўся ў маёнтку Басін Бабруйскага*

*павета Мінскай губерні. У час пакушэння на цара ён кінуў самаробную бомбу, быў смяротна паранены, памёр, нікога не выдаўшы)*

55. Дзе знаходзяцца генеалагічныя карані вялікага падарожніка, даследчыка Цянь-Шаня і Паміра - М. М. Пржавальскага? *(На Віцебшчыне. Род Перавальскіх)*

56. Назавіце беларускага рэвалюцыянера, нястомнага падарожніка, які быў адным з першых даследчыкаў быту, звычаяў і фальклору казахаў. *(Ураджэнец Нясвіжа Адольф Янушкевіч, які пасля паўстання 1863 г. быў сасланы ў Табольск, затым у Ішым)*

57. Адзін з беларускіх вучоных пасля паўстання 1863 г. быў вымушаны падацца за мяжу. Ён падарожнічаў па Гвіяне і Перу, Брэтані і Далмацыі, Францыі і Турцыі. Гэты вучоны адкрыў і ўпершыню апісаў не адзін від раслін і жывёл (адзін з відаў лаўра потым быў названы імем адкрывальніка), адкрываў сакрэты кітайскай чорнай тушы, апісваў звычаі і абрады жыхарру Паўднёвай Амерыкі. Падарожнік і ўрач, батанік і заолаг, географ і геолаг, ён пакінуў прыкметны след у развіцці прыродазнаўства мінулага стагоддзя. Як яго звалі? *(Канстанцін Міхайлавіч Ельскі. Нарадзіўся 17лютага 1837 годаў в. Ляды Смілавіцкай воласці Мінскай губ. Закончыў Маскоўскі і Кіеўскі універсітэты)*

58. У сярэдзіне XIX ст. (20 снежня 1860 г.) у в. Лаша Гродзенскага павета нарадзіўся вялікі беларускі вучоны - стваральнік «Этнаграфічнай карты беларускага племя», аўтар капітальных прац ва ўсіх галінах беларускага мовазнаўства. Сапраўдным помнікам жыцця гэтага чалавека з'яўляецца праўдзіва названая беларускай энцыклапедыяй трохтомная праца «Беларусы». Як яго звалі? *(Яўхім Фёдаравіч Карскі, філолаг-славіст, заснавальнік беларускага мовазнаўства, філалогіі і фалькларыстыкі)*

59. У канцы XIX ст. у Беларусі працаваў таленавіты вучоны, слава пра якога грымела далека за межамі радзімы. Ім захапляўся навуковы Берлін, Вена, Парыж і Рым, а яго навуковыя інтарэсы ахоплівалі галіны фізікі, медыцыны, прыродазнаўства. Гэты вучоны выкарыстоўваў токі громаадводаў для павышэння ўрадлівасці глебы, упершыню ажыццявіў электракультывацыю глебы без пабочных крыніц току, адкрыў электраграфічны метад для дыягностыкі розных хвароб, вынайшаў спосаб вылечвання паралічоў і застарэлага тэўматызму пры дапамозе электрамасажу і электратэрапіі. У 1881 годзе, г.зн. за чатыры гады да вынаходства радыё рускім вучоным А. С. Паповым, ён стварыў бяздротавы тэлеграф. Назавіце яго імя. *(Якуб Антонавіч Наркевіч-Ёдка, нарадзіўся 27 снежня 1848 г. у фальварку Наднёман, цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Памёр 6 лютага 1905 г.)*

60. Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі. Гэта імя з вялікай павагай вымаўляюць ва ўсім свеце. Яго раманы «Злачынства і пакаранне», «Браты Карамазавы» сталі шэдэўрамі сусветнай літаратуры. Нарадзіўся Ф. М. Дастаеўскі ў Маскве, але род Дастаеўскіх – беларускага паходжання і яго

продкі жылі ў Беларусі. Дзе знаходзіцца радавы маёнтак Дастаеўскіх? *(У в. Дастоева на Піншчыне, цяпер Іванаўскі раён Брэсцкай вобл.)*

61. Дзе пачаў сваю рэвалюцыйную дзейнасць ураджэнец Міншчыны, «рыцар рэвалюцыі» Ф. Э. Дзяржынскі? *(У г. Ліда ў 1896 годзе)*

62.1 сакавіка 1898 г у Мінску адбыўся I з'езд РСДРП, на якім было абвешчана аб стварэнні марксісцкай партыі ў Расіі. У чыім доме адбылася сустрэча дэлегатаў з'езда? *(У доме мінскага чыгуначніка сацыял-дэмакрата Пятра Васільевіча Румянцава)*

63. Дэлегатам I з'езда РСДРП быў адзіі цярынаслаўскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабоочага класа», юрыст, які нарадзіўся ў в. Навіны Слуцкага павета Мінскай губерні. Гэты чалавек у 1908 г. на судзе ў Мінску абараняў Якуба Коласа, якога судзілі за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе. У якасці адваката ён абараняў на судовых працэсах членаў Беларускай сялянска-рабочай грамады. Назавіце яго імя. *(К. А. Петрусевіч, 1872-1949 гг.)*

64. Падымайся з нізін, сакаліна сям'я.
Над крыжамі бацькоў над нягодамі.
Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі.

Гэтыя бессмяротныя радкі ў 1905 годзе напісаў адзін з заснавальнікаў беларускай савецкай літаратуры. *(Янка Купала)*

65. Пасля рэвалюцыі 1905-1907 гг. былі закладзены асновы беларускай прафесійнай музыкі. У Вільні кіраўнік беларускага харавога калектыву піша сюіту для сімфанічнага аркестра (1910 г.). Гэты першы інструментальны твор беларускай музыкі звязаны з інтанацыямі народных песень. Хто яго напісаў? *(Людамір Міхал Рагоўскі)*

66. На хвалі першай рускай рэвалюцыі ўзнялася беларуская тэатральная культура. У 1905 годзе на Дзісненшчыне ўзнікае аматарскі гурток, які перарос у «Першую беларускую трупу» і ператварыўся ў прафесійны тэатр. Гэтым калектывам кіраваў буйны акцёр, балетмайстар і рэжысёр... *(Ігнат Буйніцкі)*

67. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя. Легендарны выбух «Аўроры» падаў сігнал да штурму Зімняга палаца. Дарэчы, на крэйсеры «Аўрора» з 570 членаў экіпажа 75 былі выхадцамі з Беларусі. Самае значнае даручэнне - далажыць аб падзенні Зімняга - выпала выканаць селяніну з беларускай вёскі Сакольнічы Чэрыкаўскага павета. Каму? *(А. І. Попелю)*

68. У 1917 годзе ў Беларусі было створана Першае таварыства беларускай драмы і камедыі, у якім працаваў адзін з заснавальнікаў беларускага савецкага тэатра, акцёр, рэжысёр, драматург, мастак, тэатральны дзеяч. Ён творча развіваў традыцыі старажытнага беларускага тэатра (батлейкі, народнай драмы, школьнага тэатра). Як яго звалі? *(Уладзіслаў Іосіфавіч Галубок, нарадзіўся 3/15 мая 1882 г. на станцыі Лясная Мінскай губ.)*

69. 1918 год. Савецкі ўрад пераязджае ў Маскву. Першым камендантам Крамля быў прызначаны верны паплечнік У. І. Леніна, сын беларускага народа... *(Уладзімір Дзмітрыевіч Бонч-Бруевіч)*

70. 30-31 снежня 1918 г. у Смаленску I з'езд КПБ прыняў рашэнне аб стварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Назавіце першага старшыню Часовага Рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі. *(Змітро Фёдаравіч Жылуновіч - Цішка Гартны)*

71. У 1920 г. у Мінску быў арганізаваны Першы беларускі дзяржаўны тэатр (з 1945 г. - Беларускі дзяржаўны тэатр імя Я. Купалы). Сярод пачынальнікаў аднаго з вядучых тэатраў нашай краіны былі В. Крыловіч, Б. Платонаў, Г. Глебаў. А кіраваў тэатрам таленавіты драматург, рэжысёр і акцёр... *(Еўсцігней Афінагенавіч Міровіч, сапр. прозв. - Дунаеў)*

72.1921 г. Па ўмовах Рыжскага міру заходняя частка Беларусі засталася за буржуазнай Польшчай, але беларускі народ падняўся на барацьбу за ўласнае існаванне. У 1925 годзе была арганізавана Беларуская сялянска-рабочая грамада, якая патрабавала самавызначэння, аб'яднання ўсіх беларусаў у адной дзяржаве. На чале грамады стаяў выдатны дзяржаўны дзеяч і паэт, аўтар першай навуковай беларускай граматыкі... *(Бранiслаў Тарашкевіч, 1892-1937 гг.)*

73. Віравала Заходняя Беларусь. 27 студзеня 1936 г. у зале Віленскага акруговага суда прагучаў стрэл у правакатара Я. Стральчука, які даваў паказанні супраць дзеячаў заходнебеларускага руху. 23-гадовы юнак цяжка параніў правакатара, але сам быў схоплены і асуджаны на смерць. Імем гэтага патрыёта названа адна з вуліц г. Мінска Як яго звалі? *(Сяргей Прытыцкі)*

74. Хто быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга пад нумарам 1? *(28 ліпеня 1921 г. Мікіта Захаравіч Мінчукоў пад в. Чыгрынка Кіраўскага р-на Магілёўскай вобласці ў час веснавой паводкі выратаваў стометровы мост праз раку Друць. За свой гераічны ўчынак М. З. Мінчукоў атрымаў першую працоўнцю ўзнагароду Радзімы)*

75. У 1927 г. у Гродне на базе жывога кутка мясцовай гімназіі быў створаны адзіны ў Беларусі заапарк, які абавязаны сваім нараджэннем вялікаму аматару і знаўцу расліннага і жывёльнага свету. Як яго звалі? *(Ян Каханоўскі, выкладчык Гродзенскай гімназіі)*

76. Адзін з савецкіх лётчыкаў першым у нашай краіне двойчы быў узнагароджаны Залатой Зоркай Героя Савецкага Саюза. Назавіце імя лётчыка і за што ён атрымаў гэтыя пачэсныя ўзнагароды СССР? *(Сяргей Іванавіч Грыцавец, нарадзіўся ў в. Бараўцы Навагрудскага павета 6 ліпеня 1909 г. Першую ўзнагароду ён атрымаўза баіў Іспаніі, а другую - пад Хал-хін-Голам)*

77. Вялікая Айчынная вайна. 26чэрвеня 1941 г. пад Радашковічамі савецкі лётчык накіраваў свой ахоплены агнём самалёт на калону фашысцкіх танкаў і бензацыстэрнаў. Імя гэтага героя... *(Мікалай Гастэла, сапраўднае прозвішча - Гасціла)*

78. Адзін з першых партызанскіх атрадаў нашай краіны быў арганізаваны на тэрыторыі Беларусі 26 чэрвеня 1941 года. У якім раёне дзейнічаў гэты атрад і хто ім камандаваў? *(Партызанскі атрад «Чырвоны Кастрычнік», які ўзначальвалі Ціхан Піменавіч Бумажкоў і Фёдар Іларыёнавіч Паўлоўскі, дзейнічаў у Акцябарскім раёне Гомельскай вобласці)*

79. Каму з савецкіх партызан першаму было прысвоена ганаровае званне Героя Савецкага Саюза? *(Ціхану Піменавічу Бумажкову)*

80. Назавіце імя старэйшага савецкага партызана. *(Стогадовы дзед Талаш)*

81. У гады Вялікай Айчыннай вайны былі ўзяты на ўзбраенне вугальныя міны, пры дапамозе якіх паляцелі пад адхон сотні фашысцкіх цягнікоў. Дзе гэта было? *(У Оршы. Канстанцін Заслонаў, былы падпольшчык, а затым камандзір партызанскага атрада, які змагаўся супраць фашыстаў пад Оршай, арганізаваў выраб вугальных мін)*

82. Зімой 1943 года палескі селянін паўтарыў подзвіг Івана Сусаніна. Назавіце гэтага героя. *(Іван Самуілавіч Цуба, сямідзесяцігадовы ўраджэнец вёскі Навіна Слуцкага павета Мінскай губерні)*

83. Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны,
За няволю, за кайданы
Рэжце гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны...

Гэты верш у гады Вялікай Айчыннай вайны хадзіў у лістоўках, яго чыталі на сходах сялян, на канцэртах партызанскіх агітатрадаў. А напісаў гэты верш... *(Янка Купала)*

84. Падымалася Беларусь на барацьбу з захопнікамі. Званы нашай памяці ўваскрашаюць імёны обальскіх і мінскіх падпольшчыкаў, піянера-героя Марата Казея, соцень тысяч ахвяр беларускіх вёсак, якія так і не адрадзіліся. Журботна б'юць у сэрца званы памяці. Своеасаблівым рэквіемам загінуўшым беларусам з'явіўся верш «Кожны чацвёрты». Хто яго напісаў? *(Беларускі паэт Анатоль Вярцінскі)*

85. Кульмінацыяй барацьбы мінскага падполля было забойства гаўляйтэра Кубэ, якое ажыццявілі беларускія патрыёты - А. Мазанік, М. Осіпава, Н. Траян. У якім мастацкім фільме адлюстравана гэта падзея? *(«Гадзіннік спыніўся апоўначы»)*

86. За разбураныя гарады, вёскі, за смерць мільёнаў савецкіх людзей помсцілі ворагу разам з іншымі народамі і беларусы. Адзін з іх, 18-гадовы юнак, вядомы снайпер, знішчыў пад Ленінградам 125 гітлераўцаў. Як яго звалі? *(Фёдар Смалячкоў)*

87. Восень 1941 г. Цяжкія баі пад Масквой. Адной з яркіх старонак абароны сталіцы нашай Радзімы з'явіўся конны рэйд па тылах фашыстаў, якім кіраваў ураджэнец Беларусі, генерал... *(Леў Даватар)*

88. 6 ліпеня 1943 года на Арлоўска-Курскай дузе ў паветры адбылася незвычайная падзея: упершыню ў гісторыі лётчык у адным баі збіў 9

самалётаў ворага. Герой загінуў, але яго імя назаўсёды засталося ў сэрцах людзей. Яго звалі... *(Аляксандр Канстанцінавіч Гаравец)*

89. У гады Вялікай Айчыннай вайны адзіным у свеце лётчыкам, які зрабіў 4 паветраныя тараны самалётаў ворага, быў сын беларускай зямлі, герой Савецкага Саюза... *(Барыс Іванавіч Коўзан)*

90. Прыкладам мужнасці і гераізму з'яўляецца подзвіг полацкай камсамолкі, якая вынесла з поля бою 128 раненых. Гэтая дзяўчына — адзіная з медсясцёр Савецкай краіны была ўзнагароджана вышэйшым пачэсным знакам Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа - медалём Флорэнс Найцінгейл. Назавіце яе імя. *(Зінаіда Тусналобава-Марчанка)*

91. Пры абароне г. Ленінграда і вострава Ханка эскадрай Балтыйскага флота камандаваў беларус, віцэ-адмірал... *(В. П. Дрозд)*

92. 30 красавіка 1945 года Сцяг Перамогі ўзняўся над рэйхстагам. Адным з двух герояў, якія ў Берліне паставілі кропку ў разгроме фашыстаў, быў былы беларускі партызан... *(Міхаіл Аляксандравіч Ягораў)*

93. У берлінскім Трэптаў-парку стаіць як сімвал Перамогі помнік воіну-вызваліцелю. Аўтар гэтага манумента - А. Вучэціч. А права-бразам воіна-вызваліцеля быў савецкі салдат, ураджэнец Беларусі і жыхар г. Мінска... *(Трыфан Андрэевіч Лук'яновіч)*

94. Пасляваенныя гады... Цяжка адраджалася зямля, якую немцы зрабілі зонай пустыні. Салдаты, вярнуўшыся дадому, шлі ў новы бой - бой за вялікі хлеб. «Маяком» працоўнай славы ў пасляваенныя гады стаў калгас «Рассвет» Кіраўскага раёна. Хто ўзначальваў гэту гаспадарку? *(Кірыл Пракоф 'евіч Арлоўскі)*

95. Беларуская навука. Далёка за межы рэспублікі ляціць слава лра нашых атамшчыкаў, кібернетыкаў, літаратуразнаўцаў гісторыкаў, фалькларыстаў. Вялікую ўвагу ўдзяляюць нашы вучоныя захаванню і развіццю нацыяналынай спадчыны. Сапраўднай энцыклапедыяй беларускага фальклору стала 30-томнае выданне. Як называецца гэтае выданне? *(«Беларуская народная творчасць»)*

96. Своеасаблівым гімнам савецкай навуцы сталі этапы асваення космасу, раскрыццё таямніц невядомага нам свету. Назавіце імёны беларускіх касманаўтаў. *(Пётр Ільіч Клімук, Уладзімір Васільевіч Кавалёнак)*

97. Памяць сэрца... Мемарыяльны комплекс «Хатынь» стаў сімвалам нашага болю, заклікам да барацьбы за мір. Аўтараў гэтага унікальнага ансамбля ў 1970 г. Радзіма адзначыла высокай узнагародай. Назавіце іх імёны. *(Архітэктары Ю. М. Градаў, В. П. Занковіч, Л. М. Левін, скульптар С. І. Селіханаў)*

98. Адроджаная зямля... Мы ідзём па вуліцах беларускай сталіцы, захапляемся яе веліччу, прыгажосцю. Адзін з праспектаў горада носіць імя сына беларускага народа, арганізатара Расонскага камсамольскага падполля, камандзіра партызанскага атрада імя Шчорса, дзяржаўнага дзеяча Беларусі... *(Пятра Міронавіча Машэрава)*

99. Беларусь... Чароўны песенны край, апеты многімі паэтамі і кампазітарамі. Мелодыі аднаго з іх - буйнейшага кампазітара нашай краіны, народнага артыста БССР - гучаць на розных паралелях і мерыдыянах планеты Зямля. Яго песні «Памяць сэрца», «Балада пра Хатынь», «Жураўлі на Палессе ляцяць» і іншыя ўвайшлі ў скарбніцу сучаснага песеннага мастацтва Беларусі. Назавіце яго імя. *(Ігар Лучанок)*

100. Радзіма мая дарагая,

Красуйся і ў шчасці жыві...

Гэтыя радкі гучаць у сэрцах беларусаў адвечнай песняй любові да роднай зямлі, яе народа. А напісалі гэтую песню... *(Кампазітар Уладзімір Алоўнікаў і паэт Алесь Бачыла)*

**Вядучы.** Вось мы і прайшлі па мінулых і сучасных шляхах Беларусі, і калі наша падарожжа вас зацікавіла, калі вам яшчэ больш захацелася пазнаць наш горды, таленавіты народ, удасканаліць свае веды, буду лічыць сваю задачу выкананай. У добры час!

*Гучыць песня У. Алоўнікава на верш А. Бачылы «Радзімамая дарагая». На экране - каляровы дакументальны фільм альбо слайды пра сучасную Беларусь.*

# «БЕЛАРУСЬ МАЯ, РОДНЫ КРАЙ...»

*Тэматычны вечар*

*Смірнова, В. «Беларусь мая, родны край...» : тэматычны вечар / В. Смірнова // Бібліятэка прапануе. – 2009. - №5. – С. 16-19.*

*Зала афармлена ў беларускім стылі. Абавязкова герб і сцяг. Вядучыя апрануты ў нацыянальнае адзенне. На фоне беларускай музыкі гучаць словы вядучага.*

**Вядучы 1:** Добры дзень, паважаныя сябры! Вас вітаюць удзельнікі тэматычнага вечара «Беларусь мая, родны край...», прысвечанага дзяржаўнай сімволіцы Рэспублікі Беларусь.

**Чытач:** Неба чыстае і глыбокае
І бярозавы ціхі гай –
Беларусь мая сінявокая,
Беларусь мая, родны край.
Славай слаўная ты былiннаю,
Залатою сваёй красой,
Майскай песняю салаўінаю
І вясёлкамі над ракой.
Неба чыстае і глыбокае
І бярозавы ціхі гай –
Беларусь мая сінявокая,
Беларусь мая, родны край.

*У. Карызна*

**Вядучы 2:** Рэспубліка Беларусь займае заходнюю ўскраіну Усходне-Еўрапейскай раўніны ў басейне верхняга цячэння Дняпра і Нёмана, сярэдняга цячэння Заходняй Дзвіны і Заходняга Буга, сярэдняга і ніжняга цячэння Прыпяці.

Мяжуе з Польшчай, Літвой, Латвіяй, Пскоўскай, Смаленскай і Бранскай абласцямі Расіі, пяццю абласцямі Украіны.

Плошча Беларусі - 207,6 тыс. кв. км.

**Вядучы 1:** У Беларусі каля 11 тысяч азёраў, з іх ледзь не два дзесяткі маюць назву Белае. Белая - так называюць некаторыя рэкі ды вёскі. У Камянцы восьмае стагоддзе стаіць Белая вежа. Адна з нашых пушчаў - Белавежская.

**Вядучы 2:** Дужа любяць беларускую старонку белыя буслы. Кожную вясну вяртаюцца сюды з далёкага выраю - да гнёздаў сваіх. І ці не ад радасці сустрэчы з радзімаю яны так гучна клякочуць у сваіх буслянках?

**Вядучы 1:** Асаблівую ж ласку да свайго краю заўсёды меў чалавек. Тут ён працягваў свой род, развіваў мову, шанаваў гэтую зямлю і спадчыну, сваіх

продкаў бласлаўляў нашчадкаў. І гэта ўсё - цудоўна. Мудры народ заўважыў: «Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы», «Радзіма - матка, чужына - мачаха».

**Вядучы 2:** На працягу многіх стагоддзяў Бацькаўшчына з поспехам адбівалася ад лютых ворагаў . Патрыёты не раз перамагалі ўдвая і нават утрая большыя варожыя войскі... Яшчэ многа іншых цудаў адбывалася на нашай зямлі.

**Вядучы 1:** А зараз уважліва паглядзіце на герб нашай краіны. Звярніце ўвагу на зялёны контур тэрыторыі рэспублікі на геаграфічнай карце. Зялёны контур у залатых промнях узыходзячага Сонца. Чытач.

На карце вялікага свету
Яна, як зялёны лісток,
Песня гарачага лета,
Крынічнай вады глыток,
Адвечная калыханка,
Душы запаветны куток.

*В. Вітка*

**Вядучы 2:** Гэта сімволіка зразумела кожнаму: гэта наша зямля. Мы захаваем яе ў тых межах, у якіх яна нам перададзена продкамі, папярэднімі пакаленнямі.

А хто мы, адкуль мы родам, хто нашы продкі?

**Чытач:** Сваіх не ведаю вытокаў
І радаслоўную забыў:
Здаецца, дзед быў так далёка,
Не ведаю, кім продак быў...
А кім яны былі калісьці,
У той, неразгаданы век? і
І як яны шукалі выйсця
З лясоў, з дрыгвы, з разліваў рэк...
Не знаю, хто ў маёй аснове -
Вандроўнікі ці ўцекачы,
І хто ў маім азваўся слове -
Радзімічы ці крывічы...
Магчыма ёсць пачатак польскі?..
Аднойчы, мне зірнуўшы ў твар,
Віталі Фрыдрыхавіч Вольскі
Сцвярджаў, што быццам я з татар.
Усё магчыма, усё магчыма,
Калі згубіўся продкаў след,
Калі наіўнымі вачыма
Гляджу, як і яны, на свет.
І тым заўсёды ганаруся,
Што ў шчаслівейшую пару
Я нарадзіўся ў Беларусі

І так, як маці, гавару.

*С. Грахоўскі «Мая радаслоўная»*

**Вядучы 1:** Контур краіны знаходзіцца ў сярэдзіне герба, утворанага вянком з каласоў, пераплеценых з аднаго боку ружовымі кветкамі канюшыны, з другога - блакітнымі кветкамі ільну. Жыта, канюшына і лён – найболыш характэрныя для нашай рэспублікі сельскагаспадарчыя культуры. Вянок утвораны з жытніх каласоў. Па сённяшні дзень многія жыхары нашых вёсак ставяць іх у хаце як знак працоўнай удачы ў будучым. Жыта - наш хлеб - аснова жыцця, сімвал мірнай працы. Канюшына - гэта сімвал сувязі са стваральным светам жывёл: канём, каровай, авечкай, для якіх яна - лепшы корм. Адгадайце, пра што складзена загадка: «У зямлі расце, блакітам цвіце, хто яго збірае, той сукенку мае?» Кветкі льну таксама ёсць у нашым гербе, бо лён - гэта бавоўна Поўначы. Людзі вырошчвалі лён з даўніх часоў, самі ткалі палатно, шылі з яго адзенне. Ніжэй контура граніцы Рэспублікі Беларусь змешчаны зямны шар з узыходзячым над ім сонцам і залатымі промнямі. Зямны шар - гэта знак таго, што Рэспубліка Беларусь успрымае ўсе народы Зямлі, як раўнапраўных сяброў і партнёраў, гатова з імі дружыць і гандляваць. З элементаў герба звяртае на сябе ўвагу чырвоная зорка. Пяціканцовая зорка - сімвал чалавека і чалавецтва, знак мужнасці і высокіх памкненняў. Герб абвіты чырвона-зялёнай стужкай, на якой знізу чытаем надпіс залацістага колеру - «Рэспубліка Беларусь». Герб упрыгожвае ўрадавыя ўстановы, як бы афармляе іх паўнамоцтвы. Усе важнейшыя дакументы і пячаткі ўтрымліваюць выяву Дзяржаўнага Герба.

**Чытач:** Над ім каронай залатой
зіхціць даспелае калоссе
Дняпроўскіх, Нёманскіх далін.
У ім зраднілася, злілося
жыццё людзей у герб адзін.
Дзяржаўны герб, як сонца,
свеціць на сцягу, у сэрцы, над зямлёй.
І Беларусь у белым свеце
нязгаснай славіцца красой.

**Вядучы 2:** А вось ён - сцяг нашай краіны, галоўны сімвал нашай Радзімы. Наш сцяг мае тры колеры: чырвоны, зялёны і белы.

Чырвоны колер са старажытных часоў служыць знакам Сонца, сімвалізуе кроўныя повязі, брацтва, барацьбу за справядлівую справу; адначасова гэта знак шчаслівага жыцця.

Зялёны колер - гэта колер Прыроды, нашай карміцелькі, на шай першамаці. Гэта колер палёў і лясоў, якія здаўна займалі асноўную частку нашай краіны.

Нарэшце, белы колер – гэта перш за ўсё колер свабоды. Недарэмна лічаць, што назва нашай краіны - Беларусь - звязана з непахіснай воляй да свабоды.

Разам з тым белы колер – гэта колер маральнай чысціні і мудрасці. І гэтыя якасці павінен свята захоўваць у сваёй душы сапраўдны сын беларускай зямлі.

**Чытач:** Белы ручнік мой, белы абрус,
сам я няцёмны душою.
Хто ў белым свеце я?
Я - беларус,
будзьце знаёмы са мною.
Дружбу цаню і гатовы дружыць
я ці не з цэлым сусветам.
Свету адкрыты, хачу вольна жыць,
добрым служыць запаветам.
Яркая зорка надзеі гарыць,
торыцца шлях наш вякамі.
Шчасце трывалае можна стварыць
толькі сваімі рукамі.
Можна ў далёкіх краінах пабыць -
хай там марскіх, ці горных...
Нельга радзімых мясцінаў забыць,
фарбаў лясных і азёрных.
Пасябраваць можна з мовай чужой,
ёю валодаць свабодна;
нельга адно здрадзіць роднай сваёй
і адрачыся ад роднай.
Белы ручнік мой, белы абрус.
Вышыла мама кашулю.
Не прамяняю сваю Беларусь -
не выбіраю матулю.

*В. Жуковіч «Беларус»*

**Вядучы 1:** Сцяг Беларусі мае яшчэ адну важную дэталь - гэта чырвоны народны узор - арнамент.

На Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь адлюстравана частка найбольш старажытнага і тыповага арнаменту. Работа была выканана ў 1917 годзе і належыць нашай зямлячцы, сялянцы Матроне Маркевіч з вёскі Касцелішча Сенненскага павета Віцебскай вобласці. Сцяг пастаянна ўзняты над будынкамі важнейшых дзяржаўных устаноў, яго маюць усе выканаўчыя ўлады раёнаў і абласцей, навучальныя ўстановы, прадпрыемствы, вайсковыя часці, арганізацыі і навукова-даследчыя інстытуты.

Беларускі Дзяржаўны сцяг падымаецца ў час спартыўных спаборніцтваў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі, калі беларускія спартсмены займаюць першыя месцы.

Ніводнае свята не абыходзіцца без дзяржаўных сцягоў.

Калі здараецца ўсенароднае гора, калі гіне ці памірае хто-небудзь з выдатных людзей Айчыны, да сцягоў прымацоўваюць чорныя стужкі, і самі сцягі схіляюцца. Паклон сцягоў - гэта паклон усяго народа перад памяццю.

Сучасныя герб і сцяг Рэспублікі Беларусь прыняты ўсенародным галасаваннем 14 мая 1995 года.

**Вядучы 2:** Кожную раніцу ў 6 гадзін па радыё гучыць Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь. Урачыстая мелодыя выконваецца ў час нашых свят, вялікіх перамог, а напісана яна яшчэ ў гады Вялікай Айчынай вайны ў 1944 г. Несцерам Сакалоўскім на верш Міхася Клімковіча «Мы - беларусы». Гімн на музыку Несцера Сакалоўскага быў зацверджаны ў 1955 годзе, з пачатку 1990-х гадоў выконваўся без слоў і, нарэшце, 2 ліпеня 2002 года быў зацверджаны ранейшы тэкст гімна з дапаўненнямі, напі- санымі паэтам У. Карызнай.

Нарадзіліся ў маці тры сыны. Задумалася маці: якія імёны даць сынам, у якое адзенне прыбраць. «Ты, сынок, - сказала маці першаму, - насі адзенне, па якім усе будуць пазнаваць нашу багатую і мужную зямлю». І прыбрала яна сына ў чырвона-зялёна-белую вопратку. На вопратцы сына заззяла чырвоная зорка. «Беражы яе, - сказала маці, - і глядзі, каб ніколі- ніколі не патухала зорка, бо з ёю ў сэрцы змагаўся наш народ за вольнае жыццё, за сонечнае неба.

А цябе, сынок, - кажа маці другому сыну, - буду прасіць, каб насіў маю карону. Я спляла яе з жытняга калосся, кветак канюйіыны, ільну, якімі квітнее наша зямля.

А ты, мой галасісты сынок, будзеш спяваць маю самую любімую, дарагую песню», - папрасіла маці сына трэццяга і падарыла яму ноты і словы пёсні.

А потым звярнулася яшчэ раз да сваіх малайцоў:

«Ты, сынок першы, будзеш вядомы ў нашай Дзяржаве пад іменем Сцяг; ты, сынок другі, будзеш называцца Гербам, а ты, сынок трэці - Гімнам».

Так і жывуць у маці тры сыны - Сцяг, Герб, Гімн.

А хто маці іх, як яе называюць?

**Чытач (у беларускім адзенні):**

Блакіт нябёс і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус,
Мой край завецца Беларуссю,
А сам я - хлопчык - беларус.

**Вядучы 1:** «Беларусь, зямелька, галубка мая...» Колькі цяжкіх выпрабаванняў за сваю гісторыю выпала на тваю долю разам з народам, але народ твой мужны змагаўся, перамагаў, а ў часы адчаю чэрпаў сілы з крыніц тваіх.

**Чытач:** На роднай зямлі ёсць такія крыніцы,
адкуль выцякае гаючы бальзам.
З іх вораг ніколі не зможа напіцца,
і здраднік не зможа абмыць сваіх ран.
Калі ж ты быў чысты заўсёды душою,

не ведаў злачынства, ні цёмных дарог,
калі ты сагнуўся пад цяжкай бядою,
ці ў бойцы знясілеў, ад мук занямог, -
ідзі і напіся з крыніцы гаючай,
да роднай зямелькі прынікні на міг,
ты голас пачуеш, жывы і пявучы,
і сэрцам зачэрпнеш там сіл маладых.
Ты зноў станеш смелым, здаровым і дужым,
гатовым на бой за Радзіму сваю.
Гаючых крыніцаў ёсць многа, мой дружа,
што ў роднай зямельцы нам сілы даюць.

*М. Машара*

**Вядучы 2.** Цячэ рака часу. Мінула ўжо 68 год з таго страшнага дня, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Заraslі шрамы акопаў зніклі папялішчы спаленых гарадоў, выраслі новыя пакаленні. Аче ў памяці чалавецтва 22 чэрвеня 1941 года застанецца не проста як ракавая дата, але і як рубеж, пача- **так адліку доўгіх 1418 дзён і начэй вайны.**

**Чытач:** Гэта - працягласць апошняй вайны,
Якая яшчэ прарываецца ў сны,
У нашыя сны, А не нашых дзяцей.
Для іх яна казкай здаецца часцей.
Больш тысячы дзён
Не згінаўся народ.
А хто пералічыць удоў і сірот?
Столькі вяла да Берліна дарога,
Столькі чакала жывых
Перамога...
«Колькі ж гадоў прагрымела вайна?» -
Пытаю ў дачушкі.
Не знае яна.
Не лёгка на годы Вайну падзяліць.
Яна, нібы свежая рана,
Баліць!
На годы вайна
Не падзеліцца гладка:
Ваенныя дні
Застаюцца ў астатку.
Не знае нічога
Пра тое дзіцятка,
Што слёзы ў астатку,
Што гора ў астатку,
Што боль у астатку
І гнеў у астатку...

*Ю. Свірка «1418 дзён»*

**Вядучы 1:** Амаль 65 гадоў назад на Беларусі адгрымелі апошнія залпы, але і зараз зямелька наша час ад часу агаляе свае раны, бо не бывае ў вайны эпілога...

**Чытач:** Не бывае ў вайны эпілога
- Памяць чорна заносіць крыло.
Замест поля - дзічэе аблога.
Божа мой, як усё зарасло!
Конік, конік! Чаго ты стракочаш
У бур'яне - самотнай траве?
Можа, паўшых збудзіць яшчэ хочаш?
Спадзяешся, што хто ажыве?
Эх ты, конік! Ад мора і сушы
Тут з агнём і жалезам прайшлі,
І - хмарынкамі чыстыя душы
На нябёсы высока ўсплылі.
Памяць сцішана полем праступе,
Каб адчуць хоць бы подых
людзей.
Ты ж гарачую стужку пустую
Цягнеш зноў у акоп, грамацей.
Доўга веяць пякельнаму болю
У разгойданай раме лясоў
І ўгінацца жалезнаму ітолю
Ад журботных сваіх каласоў.

*С. Гаўрусёў «Не бывае ў вайны эпілога»*

**Вядучы 2:** Зямелька наша, Беларусь, пакутніца, жудаснае, страшэннае выпрабаванне выпала на тваю долю, калі 26 красавіка 1986 года выбухнуў Чарнобыль, здарылася неаб'яўленая вайна, ядзерная катастрофа. Гэта нябачная, маўклівая вайна працягваецца і зараз, у радыяцыі, якую мы не бачым і не чуем, а яна ўціхутку забірае жыцці людзей.

**Вядучы 1:** Але народ беларускі не здаўся, не склаў рук, працуе, упрыгожвае сваю Радзіму, працягвае свой род, шануе нашу цудоўную прыроду.

**Чытач:** Лес ідзе да небакраю.
Рэчка, горачка, раўніна.
Вечна сэрцу дарагая
беларуская карціна.
Ля крыніцы - медуніцы,
дзе даліна - канюшына,
дзе лясочак - верасочак, -
ой ты, родная мясціна!
А пад ветрыкам у полі
хваляй ціхай жыта ходзіць,
на прасторы, на прыволлі

сэрца мне яно лагодзіць.
Жыта наша - з васількамі,
наша неба - з жаўрукамі.
Апяваюць песняй звонкай
птушкі родную старонку.
Лес ідзе да небакраю.
Рэчка, горачка, раўніна.
Вечна сэрцу дарагая
беларуская карціна.
Я красу тваю кахаю,
ніў, лясоў і рэк гамонку,
непаўторная, святая
беларуская старонка!
*В. Жуковіч*
**Чытач:** Родны край беларускі спрадвеку,
Дзе такія ты фарбы знайшоў?
Люстраныя азёры і рэкі,
Аксамітныя цені дубоў.
Курганы, як стагі канюшыны,
Як пасцель, мурожныя лугі,
І палі, дзе жыцця вітамінам
Напаўняецца колас тугі.
Над палямі - нябёсы ў скрусе.
Абмінаючы хмар чараду,
Праплываюць бялюткія гусі,
Замуціўшыя ў рэчках ваду.
Гэтай песні гарэзныя словы
Я з юнацтва ўсім сэрцам
люблю, -
Як сваю беларускую мову,
Як маёй Беларусі зямлю!
Знаю я: абыдзі ўсю планету,
Але гэткай зямлі не сустрэць.
Беларусь. Край натхнення паэтаў!
Ды цябе немагчыма апець.
*А. Ставер, «Беларусі»*
**Чытач:** На свеце існуе такая краіна,
дзе хвоі ажно дастаюць
аблачыны,
дзе рэкі, азёры ў суседстве
з лясамі,
напоўненымі салаўёў галасамі.
У гэтай краіне ўзгоркі, раўніны
ўлетку пакрыты густой

зелянінай;
ляночак цвіце з небам сінім
у згодзе.
Тут песні і казкі з легендамі
ходзяць.
Жытамі сцяжыначкі
закалыханы.
Тут сябра спрадвек называюць:
каханы;
сяброў дарагіх запрашаюць
у госці.
Тут людзі не схільныя крыўдзіць
кагосьці.
У гэтай краіне ля хатаў
буслянкі,
а ў хатах пяшчотна гучаць
калыханкі.
Радзімаю нашай край гэты
завецца.
Хай нашай Радзіме шчасліва
жывецца!

*В. Жуковіч «Цудоўная краіна»*

*Апошні радок усе разам. Выконваецца песня «Белая Русь».*

## “ЖЫВУ У БЕЛАРУСІ – І ТЫМ ГАНАРУСЯ”

*Патрыятычна-выхаваўчая гульня*

*Чывель, А. “Жыву ў Беларусі — і тым ганаруся”: патрыятычна-выхаваўчая гульня / А. Чывель // Жыву ў Беларусі — і тым ганаруся / склад. : Л. І. Макаранка, В. А. Тамашова. – Мінск : Красіка-Прынт, 2016. – 40 с. – (Бібліятэка прапануе: кніжная серыя).*

***Мэта:*** садзейнічаць асобаснаму росту вучняў як грамадзян Рэспублікі Беларусь.

***Задачы:***

Пашыраць веды дзяцей пра гістарычную спадчыну беларускага народа.

Выхоўваць патрыятызм, пачуццё гонару і па-важлівыя адносіны да Радзімы.

***Абсталяванне:*** карткі з заданнямі; эмблемы каманд; геаграфічная карта Рэспублікі Беларусь; запісы Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь і песень у выкананні ансамбля “Песняры”; слоўнікі прыказак і прымавак, выстава даведачнай літаратуры па тэме гульні; прызы для ўзнагароджання пераможцаў і граматы для ўсіх удзельнікаў гульні.

***Журы:*** настаўнікі беларускай мовы і літаратуры.

***Удзельнікі:*** зборныя каманды вучняў7-9 класаў.

*Гучыць фрагмент песні “Мой родны кут"*
*(словы Я. Коласа, музыка І. Лучанка).*

**Вядучы:** Шчыра вітаю вас, мае дарагія сябры. Сёння мы праверым, як вы валодаеце беларускай мовай, ці ведаеце гісторыю сваёй Бацькаўшчыны. У нашай гульні будуць прымаць удзел тры каманды — “Крывічы”, “Дрыгавічы” і “Радзімічы”. Так называліся ўсходнеславянскія плямёны, якія рассяліліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў далёкія-далёкія часы. Ацэньваць вашы адказы будзе наша паважаная Рада (прадстаўляе членаў журы). Давайце зараз паслухаем дэвізы каманд.

*Удзельнікі каманды “Крывічы” чытаюць разам урывак з верша В. Жуковіча “Беларус”.*

Белы ручнік мой, белы абрус, сам я няцёмны душою.
Хто ў белым свеце я?
Я беларус,—
будзьце знаёмы са мною.

*Удзельнікі каманды “Дрыгавічы” чытаюць разам урывак з верша П. Глебкі “Беларус".*

О Беларусь, мая калыска,
Жыццё маё, прытулак мой!
З гарачаю любоўю нізка

Схіляюся перад табой.

*Удзельнікі каманды “Радзімічы" чытаюць разам урывак з верша П. Броўкі “Дарагая Беларусь”.*

Наша радасць, наша сіла,
Дзе для ўдзякі слоў збяру?
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!

**Вядучы:** Якія цудоўныя ў вас дэвізы! Я жадаю кожнай камандзе перамогі ў нашай гульні. А вось і першае конкурснае заданне; за кожны правільны адказ вы можаце атрымаць адзін бал.

***Конкурс “Край мой там, дзе Нёман льецца’***

Былога быліны, старога паданні
Плывуць, як аблітыя сонцам, чаўны
Па краю зялёным, прасторах бяскрайніх
Ад Нёмна да Сожа, ад Буга да Гайны,
Па хвалях Дняпра і шырокай Дзвіны.

П. Броўка

Вядучы раздае капітанам каманд карткі з заданнем. Вучні павінны па кароткім апісанні вызначыць, пра якое племя ідзе гаворка.

1. Гэтае племя пасялілася на Сажы і яго прытоках, у міжрэччы Дняпра і Дзясны. Пазней на гэтых землях узніклі гарады Гомель, Крычаў, Рагачоў. Правадыра племя звалі Радзім. (Радзімічы.)
2. Гэтае племя пасялілася на рацэ Днепр, у вярхоўі Нёмана і па правабярэжжы Прыпяці. На гэтых землях было шмат дрыгвяных балот. Магчыма, адсюль і паходзіць назва племя. (Дрыгавічы.)
3. Гэтае племя пасялілася на землях ад Нё-мана да заходняй Дзвіны і Дняпра. Яго назва паходзіць ад імя правадыра Крыва ці ад слова “кроўныя’’ — блізкія па крыві. (Крывічы.)

*Гучыць фрагмент песні “Белая Русь ты мая”*
*(словы У. Скарынкіна, музыка У. Мулявіна).*

Журы абвяшчае вынікі першага задання.

**Вядучы:** Дарагія хлопчыкі і дзяўчынкі, вы добра справіліся з першым заданнем, малайцы. А цяпер праверым, ці ведаеце вы, калі ўзніклі старажытныя гарады нашай краіны.

***Конкурс “Туг дзяды мае жылі”***

Яны да спадобы мне, хай і старыя,
Не толькі ў гучанні хвалюючы змест.
Як многа гавораць мне назвы такія —
Мінск, Пінск, Брэст.

П. Броўка

Вядучы раздае капітанам каманд карткі з за-аннем. Вучні павінны спалучыць стрэлкамі назвы гарадоў з датамі, пад якімі яны ўпершыню ўзгадваюцца ў летапісах. (Пры выкананні гэтага задання можна дазволіць

карыстацца даведачнай літаратурай з умовай памяншэння колькасці набранных балаў у два разы.)

Заданне для каманд:

Мінск 1267

Полацк 1252

Магілёў 1156

Навагрудак 862

Брэст 1223

Гомель 1067

Нясвіж 1127

Гродна 1136

Віцебск 1323

Крычаў 980

*Гучыць фрагмент песні “Жураўлі на Палессе ляцяць”*
*(словы А. Ставера, музыка І. Лучанка).*

Журы абвяшчае вынікі другога задання.

Вядучы. А зараз мы праверым, наколькі добра вы валодаеце роднай мовай.

***Конкурс “Мова беларуская мая”***

Не проста ў словы я гуляю –
На мове роднай размаўляю.
У час дасветны, вечаровы
Кажу пяшчоты цёплай словы...

М. Мятліцкі

Падбярыце да беларускіх прыказак і прымавак адпаведныя ім рускія.

Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца. (Подлежащий камень вода не течет.)

Баючыся ваўкоў, застанешся без грыбоў. (Волков бояться — в лес не ходнть.)

Мядзведзь карове не брат. (Гусь свнньe не товарищ.)

Перш папрацуй, а тады і патанцуй. (Делу — время, потехе — час.)

Разам дзвюх сарок за хвост не ўтрымаеш. (За двумя зайцамн погонишься, ни одного не поймаешь.)

Лепш верабей у руцэ, як голуб на страсе. (Лучше синица в руках, чем журавль в небе.)

*Гучыць фрагмент песні “Слуцкія ткачыхі”*
*(словы М. Вагдановіча, музыка У. Мулявіна).*

Журы абвяшчае вынікі трэцяга задання.

**Вядучы:** Сябры, набліжаецца да свайго завяршэння наша гульня, засталося толькі адно заданне. Вы прадэманструеце, ці не забылі імёнаў нашых славутых землякоў, ці ўзгадаеце, як жылі і чым займаліся нашы продкі.

***Конкурс “Торыцца шлях наш вякамі”***

О, край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіхдзядоў!
Што мілей у свеце божым

Гэтых светлых берагоў...

Я. Колас

Як называлі Кірылу Тураўскага яго сучаснікі? *(Златавуст.)*

Каго лічаць пачынальнікам кнігадрукавання сярод усходніх славян? *(Францыска Скарыну.)*

Як звалі беларускага манаха, які быў настаўнікам будучага расійскага цара Пятра І*? (Сімяон Полацкі.)*

Пра якога полацкага князя людзі казалі, што ён можа перавярнуцца воўкам, турам, сокалам? (Усяслава Чарадзея.)

Якое імя насіла Еўфрасіння Полацкая да таго, як стала манашкай? *(Прадслава.)*

Які горад быў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага? *(Навагрудак.)*

Што такое батлейка? *(Беларускі народны лялечны тэатр.)*

Як называўся збор законаў Вялікага Княства Літоўскага? *(Статут Вялікага Княства Літоўскага.)*

Як называецца найстаражытнейшы летапіс усходніх славян? *("Аповесць мінулых гадоў".)*

Як звалі сына княгіні Гарыславы і князя Уладзіміра? *(Ізяслаў.)*

**Вядучы:** Вось і скончылася наша гульня, мае шаноўныя сябры. Я спадзяюся, што яна вам спадабалася. Давайце паслухаем рашэнне нашай Рады, якая каманда перамагла ў спаборніцтве.

*Журы абвяшчае вынікі конкурсу і агульную колькасць набраных камандамі балаў і называе пераможцаў.*

*Пад гукі Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь узнагароджваецца каманда-пераможца, удзельнікі гульні атрымліваюць граматы.*

# «ШАНУЕМ ДЗІВА НА ПЛАНЕЦЕ – СВЯТУЮ НАШУ БЕЛАРУСЬ»

Зборнік сцэнарных матэрыялаў

да Дня незалежнасці РБ

Склад. : А. М. Міхейкіна-Белякова

ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Цэнтральная раённая бібліятэка

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

225306, г. Кобрын, вул. Жукава, 12

8(016 42) 2 36 81

E-mail: *kobrinlib@gmail.com*